114. **Малітва, звернутая да людзей** / Валянціна Локун // Маладосць. – 2010. – № 4. – С. 128–131. – Рэцэнзія на кнігу: Малітва да Калымы : лісты з «Эльгена» : [вершы] / Леся Беларуска. – Мінск : Лімарыус, 2009. – 69, [1] с. – Перад выпускнымі данымі аўтар: Беларуска Леся (Коўтун Валянціна Міхайлаўна).

## 2011

115. **Васіль Быкаў :** вядомы і невядомы : літаратуразнаўчае эсэ, успаміны / [укладальнік М. Мінзер]. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 173, [2] с., [4] л. іл. – Частка тэксту на рускай мове. – Бібліяграфія ў спасылках: с. 79–83. – Са зместу: Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. Локун. С. 5–83.

116. **Час – кнігі – гісторыя /** Валянціна Локун // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 8 красавіка (№ 14). – С. 7. – Рэцэнзія на кнігі: Книги и периодические издания до 1941 года: из фонда Брестской областной библиотеки им. М. Горького : библиографический указатель / УК «Областная библиотека им. М. Горького» ; [составители: В. А. Горбачевская, Е. И. Жук]. – Брест : Полиграфика, 2010. – 115 с. – Указатели именной, заглавий книг: с. 95–114 ; Книги войны : библиографические указатели / УК «Областная библиотека им. М. Горького» ; [составители: В. А. Горбачевская и др.]. – Брест : Полиграфика, 2010. – 114 с. – Часть текста на английском языке. – Часть текста параллельно на русском и английском языках. – Указатели: с. 29–34, 105–112.

117. **Таленавітая і валявая** / Валянціна Локун // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 6 мая (№ 18). – С. 13.

*Пра жыццёвы і творчы шлях В. Коўтун з прычыны смерці беларускай пісьменніцы.*

118. **Памяти В. М. Ковтун** / Валентина Локун // Пінскі веснік. – 2011. – 6 мая (№ 36). – С. 5.

119. **Пакліканая** / Валянціна Локун // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 19 кастрычніка (№ 42). – С. 21.

*З Валянцінай Коўтун В. Локун пазнаёмілася на пачатку 80-х гг., калі працавала над кандыдацкай дысертацыяй. Патрабаваліся навуковыя публікацыі, а справа гэта была вельмі складанай, улічваючы, што жыла Валянціна Іванаўна ў Пінску. Навуковы кіраўнік Д. Я. Бугаёў параіў звярнуцца да В. Коўтун, якая загадвала на той час аддзелам крытыкі ў часопісе «Полымя». Так знаёмства перарасло ў сяброўства на ўсё жыццё. Успаміны пра літаратурнае супрацоўніцтва.*

120. **Берасцейскае шматгалоссе** / Валянціна Локун // Маладосць. – 2011. – № 8. – С. 105–110.

*Аб прозе берасцейскіх пісьменнікаў, што жывуць на берасцейскай зямлі, і тых, хто звязаны з ёй духоўнымі каранямі. Разглядаецца проза У. Гніламёдава, М. Купрэева, В. Гапеева і інш.*

121. **Лестница, ведущая в духовную пропасть** / Валентина Локун // Нёман. – 2011. – № 11. – С. 195–202. – Библиография в подстрочных примечаниях. – Рецензия на книгу: Марыянеткі і лялькаводы : раман / Міхась Южык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 262, [1] с. – (Дэбют). – Перад выхаднымі данымі аўтар: Южык Міхась (Сотнікаў Міхаіл Юр’евіч).

## 2012

122. **Проза Уладзіміра Гніламёдава**: адраджэнне нацыянальнага эпасу / Валянціна Локун // Уладзімір Гніламёдаў: «Заставацца сабой...» / [укладальнік М. Мікуліч]. – Мінск, 2012. – С. 150–172. – (Асоба і час). – Бібліяграфія: 14 назв.

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню феномена У. Гніламёдава — выдатнага беларускага літаратуразнаўцы і крытыка, доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і выдатнага пісьменніка-раманіста — асобы першай велічыні ў сучаснай беларускай літаратуры і культуры. У артыкуле даецца дэтальны аналіз «Сямейнай хронікі ў духу барока», так фармальна абазначае аўтар свой цыкл твораў: «Уліс з Прускі», «Усход», «Расія», «Вяртанне», «Валошкі на мяжы».*

123. **Исследование, которого ждали давно** / Валентина Локун // Нёман. – 2012. – № 4. – С. 204–210. – С точки зрения рецензента. – Рецензия на книгу: Паэзія Заходняй Беларусі: (1921–1939) / М. У. Мікуліч ; [навуковы рэдактар У. В. Гніламёдаў] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 460, [2] с. – Бібліяграфія: с. 443–461 (321 назв.), бібліяграфія ў падрадковых заўвагах. – Імянны паказальнік: с. 437–442.

*Моногафия Н. Микулича, по мнению рецензента, является новаторской. Он проделал огромную работу по сбору неизвестных ранее художественных текстов, исторических документов, открыл новые имена поэтов Западной Белоруссии 1920–1930-х гг. В основу своего исследования он положил принцип стилевого подхода в изучении поэзии.*

124. **Супраць духоўнай пустаты** / Валянціна Локун // Полымя. – 2012. – № 5. – С. 164–168.

*Аб праблеме маральнай дэградацыі чалавека ў творах У. Дамашэвіча: аповесці «Доля — пустацвет» (2004) і апавяданні «Хмельнае прозвішча» (2011).*

125. **Феномен Уладзіміра Гніламёдава /** Валянціна Локун // Звязда. – 2012. – 25 жніўня.

*Пра шматгранны талент У. Гніламёдава і яго празаічныя творы апошніх гадоў.*

126. **Настальгія па страчанаму раю** / Валянціна Локун // Маладосць. – 2012. – № 12. – С. 72–76. – Рэцэнзія на: Дзікі луг : аповесць / Андрэй Федарэнка // Маладосць. – 2012. – № 6.

127. **Пакліканая** / Валянціна Локун ; фота У. Крука // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 19 кастрычніка (№ 42). – С. 21.

*Успаміны пра беларускую пісьменніцу В. М. Коўтун.*

## 2013

128. **На літаратурнай карце Еўропы** / В. І. Локун // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2013. – № 1. – С. 110–113. – Рэцэнзія на кнігу: Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэр-

тэкстуальнасць / [А. В. Вальчук і інш. ; навуковы рэдактар М. У. Мікуліч] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 575, [2] с.

129. **Сучасная беларуская кампаратывістыка:** глыбіня і маштабнасць пошуку (па старонках манаграфіі «Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць» / Валянціна Локун // Полымя. – 2013. – № 1. – С. 154–163. – Рэцэнзія на кнігу: Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць / [А. В. Вальчук і інш. ; навуковы рэдактар М. У. Мікуліч] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 575, [2] с.

130. **Новае ў беларускай кампаратывістыцы** / Валянціна Локун // Białorutenistyka Białostocka. – Białystok, 2012. – Т. 4. – С. 414–418. – Рэцэнзія на кнігу: Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць / [А. В. Вальчук і інш. ; навуковы рэдактар М. У. Мікуліч] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – 575, [2] с.

131. **По страницам белорусско-русского литературного диалога** / В. И. Локун // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2013. – № 2. – С. 117–122. – Рецензия на книгу: Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 18–19 красавіка 2012 года) / [рэдкалегія: М. У. Мікуліч (адказны рэдактар) і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – 418, [1] с. : іл.

132. **Атлантыда Анатоля Крэйдзіча** / Валянціна Локун // Маладосць. – 2013. – № 2. – С. 100–102. – Рэцэнзія на кнігу: Роднае, шчымлівае : кніга прозы / Анатоль Крэйдзіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 205, [2] с., [4] л. каляр. іл. – (Лімаўскі фальварак).

133. **Мікрасвет, у якім увасоблены макрасвет.** Штрыхі да творчага партрэта Алеся Карлюкевіча / Валянціна Локун // Роднае слова. – 2013. – № 6. – С. 85–90. – Бібліяграфія: 5 назв.

*Аб краязнаўчай дзейнасці пісьменніка і краязнаўца А. Карлюкевіча.*

134. **Белорусско-русские литературные взаимосвязи** / Валентина Локун // Нёман. – 2013. – № 2. – С. 205–213. – С точки зрения рецензента. – Рецензия на книгу: Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 18–19 красавіка 2012 года) / [рэдкалегія: М. У. Мікуліч (адказны рэдактар) і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – 418, [1] с. : іл., табл. – У надзагалоўку: Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Частка тэксту на рускай, украінскай мовах. – Бібліяграфія ў канцы асобных артыкулаў.

*В статье автор попыталась выделить наиболее общие тематические разделы и подразделы сборника с целью осмысления заложенной в них научной информации. Среди материалов главное внимание уделено статьям В. В. Гниломёдова, М. А. Тычины и др.*

135. **О Максиме Танке**, известном и неизвестном, или Когда забываешь, что ты критик / Валентина Локун // Нёман. – 2013. – № 4. – С. 189–195. – С точки зрения рецензента. – Рецензия на книгу: Максім Танк. Талент, заручаны з небам / Мікола Мікуліч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 332, [2] с., [24] л. іл. – Бібліяграфія: с. 320–333.

*О новом фундаментальном монографическом исследовании Н. Микулича — итоге многолетнего научного интереса талантливого критика и литературоведа к гению Максима Танка. Это своеобразный триптих, где автор исследует определённые грани жизни и творчества поэта, повествует о жизни подвижнической, общественной и государственной, создаёт портрет человека-эпохи в истории новой Беларуси.*

136. **Цэнтрам быційнай прасторы** / Валянціна Локун // Маладосць. – 2013. – № 10. – С. 56–60.

*Агляд літаратуры Брэсцкай вобласці. Аўтар адзначыла творы тых пісьменнікаў, якія засталіся па-за ўвагай літаратурнай крытыкі, — кніга А. Шушко «Шаны», аповесць А. Бензерука «Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў*

*караля», кніга А. Крэйдзіча «Роднае, шчымлівае», аповесць В. Гапеева «Ведзьміна тоня».*

137. **Олег Ждан:** траектория жизни — траектория таланта / Валентина Локун // Нёман. – 2013. – № 11. – С. 180–192. – Библиография: 14 назв.

*Об идейно-художественных исканиях О. Ждана в контексте доминирующей эстетики 70–80-х гг. Анализируются повести «Сопровождающий» (2006), «Гений» (2011), «Белорусцы» (2013), романы «Князь Мстиславский» (2009), «Государыня и епископ» (2012).*

138. **Птахі з падрэзанымі крыламі**. Фрэдэрык Стэндаль і Змітрок Бядуля: да праблемы свабоды і чалавека / Валянціна Локун // Полымя. – 2013. – № 11. – С. 146–154 ; № 12. – С. 120–127.

*Задача даследавання – разгледзець кропкі судакранання рамантызаваных мастацкіх дыскурсаў Ф. Стэндаля і З. Бядулі — пісьменнікаў розных па часе і сацыякультурных умовах, не прызнаных сваім часам. Разглядаецца тэма свабоды мастака ў аповесці «Салавей» З. Бядулі ў параўнанні з мастацкім светам твораў Ф. Стэндаля.*

## 2014

139. **Валянціна Коўтун** / Локун В. І. // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы ; [рэдкалегія: У. В. Гніламёдаў і інш. ; пад рэдакцыяй І. Я. Навуменкі, В. А. Каваленкі]. – Мінск, 2014. – Т. 4, кн. 3 / [І. Л. Шаўлякова-Барзенка і інш. ; навуковыя рэдактары: У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук]. – С. 704–736. – Бібліяграфія ў падрадковых заўвагах і ў тэксце.

140. **Вайна як трагедыя народнага лёсу ў творчасці Уладзіміра Гніламёдава** / Валянціна Локун // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 7–8 кастрычніка 2014 г.) / [укладальнік С. Л. Гаранін ; навуковы рэдактар А. І. Лакотка]. – Мінск, 2014. – С. 190–197. – У надзагалоўку:

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

141. **Мастацкі «код» Алены Брава** / Валянціна Локун // Полымя. – 2014. – № 3. – С. 121–126. – Бібліяграфія: 6 назв.

*У навуковым артыкуле даследуюцца адметнасці творчасці Алены Брава, якая мае свой індывідуальны мастацкі «код», што дапамагае ёй выразіць «код эпохі». Аналізуецца аповесць «Дараванне», упершыню надрукаваная ў часопісе «Маладосць» у 2011 г.*

142. **Я тут жыву і ганаруся роднай старонкай…** / Валянціна Локун // Роднае слова. – 2014. – № 5. – С. 65–68. – Бібліяграфія: 2 назв. – Рэцэнзія на кнігу: Сцяжынкамі радзімазнаўства : мерапрыемствы краязнаўчага накірунку паводле твораў Уладзіміра Ліпскага і Алеся Карлюкевіча : метадычны дапаможнік для настаўнікаў / Ірына Буторына. – Мінск : Белпринт, 2013. – 280 с. : іл., каляр. іл., партр. – Бібліяграфія: с. 261.

143. **Вайна і мір Уладзіміра Гніламёдава** / Валянціна Локун // Полымя. – 2014. – № 9. – С. 142–148. – Бібліяграфія: 12 назв.

*Аб рамане У. Гніламёдава «Ліхалецце», які друкаваўся ў часопісе «Полымя» на працягу 2012–2013 гг., а ў 2014 г. пад назвай «Вайна» выйшаў у выдавецтве «Беларуская навука». Гэта пяты твор «Сямейнай хронікі» У. Гніламёдава.*

144. **Судьбоносная встреча** / Валентина Локун // Пінскі веснік. – 2014. – 7 кастрычніка. – С. 3.

*Воспоминания В. Локун о Зое Георгиевне Малышевой, государственном и партийном деятеле, первом секретаре Пинского горкома КПБ (1985–1988) и её участии в жизни В. Локун.*

145. **Олег Ждан:** траектория жизни — траектория таланта / Валентина Локун // Наш современник. – 2014. – № 7. – С. 217–228.

146. **Алесь Карлюкевіч** — казачнік / Валянціна Локун // Роднае слова. – 2014. – № 12. – С. 18–20. – Бібліяграфія: 5 назв.

*Аб кнігах казак лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» А. Карлюкевіча.*

## 2015

147. **Зачараваныя дзяцінствам** / Валянціна Локун // Полымя. – 2015. – № 1. – С. 159–167. – Бібліяграфія: 11 назв.

*У «прыватным даследванні» разглядаюцца творы дзіцячай літаратуры «дарослых» пісьменнікаў: А. Карлюкевіча «Новыя прыгоды Шубуршуна», «Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету», Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Падарожжа ў чароўны лес», «Касмічная адысея хлопчыка Стасіка», «Казкі сіняй падушкі», «Код геніяльнасці», А. Ждана «Праздник продолжается, или Щенок, велосипед и шишка на лбу», «Приключения тритэшек в Беларуси».*

148. **У кожнага свой шлях да літаратуры** / Валянціна Локун // Полымя. – 2015. – № 5. – С. 174–176.

*Разважанні пра сённяшні шлях нацыянальнай літаратуры да чытача і чытача да беларускай кнігі ў розных фарматах.*

149. **Последние романтики XIX столетия** / Валентина Локун // Нёман. – 2015. – № 8. – С. 206–214. – С точки зрения рецензента.

*Анализ романа Олега Ждана «Не погибнет со мной» (Нёман, 2014, № 3, 4, 7, 8) о Николае Кибальчиче. Роман О. Ждана, считает В. Локун, — это дискурс не только о народовольцах, об историческом прошлом, он и о жизни современной.*

150. **Вайна як трагедыя народнага лёсу ў творчасці Уладзіміра Гніламёдава** / Валянціна Локун // Роднае слова. – 2015. – № 3. – С. 25–28. – Бібліяграфія: 6 назв.

*Тэма Першай сусветнай вайны ў творах У. Гніламёдава ў кантэксце твораў сусветнай літаратуры.*

151. **Вайна як трагедыя народнага лёсу** / Валянціна Локун // Полымя. – 2015. – № 8. – С. 132–136. – Бібліяграфія: 6 назв.

*Аб падзеях Першай сусветнай вайны ў раманнай хроніцы Уладзіміра Гніламёдава.*

152. **«Непрыдуманыя гісторыі» Марыі Ляшук** / Валянціна Локун // Народная трыбуна. – 2015. – 2 кастрычніка (№ 40). – С. 11.

*Пра аўтара «Непрыдуманых гісторый» — вядомую на Піншчыне пісьменніцу, журналіста Марыю Іванаўну Ляшук, якая пераканана, што асновай жыцця, яе галоўнай рухаючай сілай з'яўляецца любоў да Бацькаўшчыны, да таго месца, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, да ўсяго жывога на зямлі.*

## 2016

153. **Дарогі варта выбудоўваць у розных кірунках** / Валянціна Локун // Полымя. – 2016. – № 1. – С. 181–185. – Рэцэнзія на кнігу: Братэрства / Алесь Карлюкевіч. – Мінск : Звязда, 2014. – 254, [1] с.

154. **Пакліканая** / Валянціна Локун // Полымя. – 2016. – № 2. – С. 147–160. – Бібліяграфія: 18 назв.

*Гэта апошні прыжыццёвы артыкул В. Локун аб жыцці і творчай дзейнасці пісьменніцы Валянціны Коўтун.*

## 2018

155. **Дамашэвіч, У. М.** Выбраныя творы / Уладзімір Дамашэвіч ; [укладанне Г. Далідовіча ; навуковы рэдактар М. Тычына ; прадмова В. Локун]. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 617, [2] с., [4] л. іл. – (Беларускі кнігазбор : БК / Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ; аўтар праекта і галоўны рэдактар К. Цвірка. Серыя 1, Мастацкая літаратура ; [т. 95]).

# ЛІТАРАТУРА АБ ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ (1984–2018 гг.)

## 1984

156. **Шапиро, С.** Диссертация Валентины Локун / С. Шапиро // Полесская правда. – Пинск, 1984. – 7 ноября.

*Коллегия ВАК СССР 24 октября 1984 г. выдала диплом кандидату филологических наук Локун В. И. Тема диссертации — «Стилевое своеобразие современной военной белорусской прозы».*

## 1985

157. **Шапиро, С.** Диссертация Валентины Локун / С. Шапиро // Сельская газета. – 1985. – 25 января.

## 1996

158. **Карлюкевіч, А.** Маральны выбар / Алесь Карлюкевіч // Роднае слова. – 1996. – № 7. – С. 186–188. – Рэцэнзія на кнігу: Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы, 1950–1960-я гады / В. І. Локун ; рэдактар В. А. Каваленка ; АН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Янкі Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 107, [3] с. : іл. – Бібліяграфія ў падрадковых заўвагах.

159. **Шапиро, С.** Высший совет голосует за пинчанку / С. Шапиро // Полесская правда. – Пинск, 1996. – 6 марта. – Провинция — понятие не географическое.

*В. И. Локун на высшем совете Института литературы имени Я. Купалы Академии наук Беларуси путем тайного голосования избрана на должность старшего научного сотрудника института.*

## 1998

160. **Локун Валянціна Іванаўна** // Памяць. Пінск : гісторыка-дакументальная хроніка / [укладальнікі: В. М. Курсаў, С. Ф. Шапіра ; рэдкалегія: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 1998. – С. 500 : партрэт.

161. **Шушко, А. І.** Парадуемся разам / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. – 1998. – 16 студзеня.

*В. І. Локун была адзінагалосна рэкамендавана кандыдатам у Саюз пісьменнікаў Беларусі.*

162. **Федоров, С.** Рекомендовали единогласно / С. Федоров // Полесская правда. – Пинск, 1998. – 17 января.

*О рекомендации В. Локун в Союз писателей.*

163. **Мішчанчук, М.** Важныя набыткі Валянціны Локун / Мікола Мішчанчук // Заря. – 1998. – 17 марта.

*Агляд творчасці В. Локун, зроблены доктарам філалогіі, прафесарам, пісьменнікам М. Мішчанчуком.*

164. **Наша землячка** — член Союза писателей // Пінскі веснік. – 1998. – 17 красавіка.

165. **Локун, В. И.** Писательский «багаж» Валентины Локун / В. И. Локун ; взял интервью С. Шапиро // Полесская правда. – Пинск, 1998. – 29 апреля.

*Валентине Локун пришла телеграмма от известного белорусского писателя В. Павлова, что 14 апреля она принята в Союз белорусских писателей. По этому случаю она дала интервью газете о том, с каким «багажом» пришла в Союз писателей, а также о своих дальнейших творческих планах.*

166. **Локун Валянціна Іванаўна** : [прынята ў Саюз пісьменнікаў Беларусі] // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 26 чэрвеня (№ 26). – С. 4.

## 2001

167. **Побединская, С.** С идеалом тургеневской героини / Светлана Побединская ; фото Владимира Мелешенко // Пінскі веснік. – 2001. – 7 сакавіка.

*О жизненном и творческом пути, о необычной судьбе В. Локун.*

168. **Мірчук, А.** Аддаючы даніну творцу / Алёна Мірчук // Пінскі веснік. – 2001. – 20 красавіка.

*Адзін з раздзелаў навуковага зборніка вучоных з дванаццаці краін свету «Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце» адкрывае пінчанка В. Локун.*

## 2002

169. **Зубков, В.** Среди авторов — Валентина Локун / Валентин Зубков // Полесская правда. – Пинск, 2002. – 30 января.

*Вышел третий том «Истории белорусской литературы XX столетия», куда вошла статья В. Локун о творчестве И. Шамякина.*

170. **Шапиро, С.** Вторая премия Валентины Локун / Семен Шапиро // Полесская правда. – Пинск, 2002. – 6 марта.

*Премия литературно-художественного журнала «Полымя» за 2001 г. в номинации «Критика и литературоведение» присуждена В. Локун за статью «Узняцца да лёсу агульначалавечага» (№ 5).*

171. **Мірчук, А.** Прэмія часопіса — пінчанцы / А. Мірчук // Пінскі веснік. – 2002. – 7 сакавіка. – С. 2.

*В. І. Локун атрымала прэмію часопіса «Полымя» за 2001 г.*

172. **Ляшук, М. І.** Кругі жыцця, асвечаныя сэрцам / Марыя Ляшук ; фота Уладзіміра Меляшэнкі // Пінскі веснік. – 2002. – 31 мая. – С. 4.

*Пра кнігу В. І. Локун «Кругі жыцця — кругі літаратуры» аб творчасці беларускіх мастакоў слова А. Асіпенкі, У. Дамашэвіча, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Коўтун, В. Карамазава, А. Жука і інш.*

## 2003

173. **Локун Валянціна Іванаўна** // Памяць. Пінскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка / [рэдкалегія: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш. ; мастак Э. Э. Жакевіч]. – Мінск, 2003. – С. 484–485 : партрэт.

174. **Локун Валентина Ивановна** // Ученые Пинщины / ЗАО «ВЦ „Аквабел“» ; [авторы-составители: И. А. Кибак, П. Н. Синкевич]. – Минск, 2003. – С. 74.

## 2004

175. **Локун Валентина Ивановна** // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины / авт.-сост. И. А. Кибак. – Минск, 2004. – С. 134.

176. **Грышкевіч, С.** Тэксты і падтэксты нашых землякоў / Сяргей Грышкевіч // Заря. – 2004. – 24 января.

*Сярод іншых разглядаецца артыкул В. Локун «Иван Шамякин: в поиске нравственного идеала».*

177. **Побединская, С.** Сюрприз от Академии / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2004. – 30 студзеня. – С. 1.

*В. И. Локун получила поздравления от Академии наук по случаю 75-летия со дня основания НАН Беларуси и грамоту за добросовестное отношение к выполнению своих служебных обязанностей.*

178. **Побединская, С.** Оценили украинские ученые / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2004. – 19 сакавіка.

*О статье В. Локун о традициях войны и мира в творчестве Л. Толстого в развитии белорусской и украинской литератур, вошедшей в сборник учёных Института литературы Национальной академии наук и изданной в Киеве.*

179. **Побединская, С.** Диплом и премия от трех президентов / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2004. – 23 ліпеня.

*О премии и дипломе, подписанном президентами Национальной академии наук Украины, Национальной академии наук Беларуси и Академии наук Молдовы за выполнение научно-исследовательской работы о культурно-исторических белорусско-украинских связях.*

## 2005

180. **Кантор, Д.** Пинские литераторы — читателям / Дмитрий Кантор // Полесская правда. – Пинск, 2005. – 9 февраля.

*Об итогах на творческой ниве пинских литераторов за 2004 г. В их числе В. Локун.*

## 2006

181. **Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы (Мінск).** Працы Інстытута літаратуры НАН Беларусі (1981–2005) : бібліяграфічны даведнік / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы ; [складальнік М. У. Пінчук ;

рэдкалегія: С. С. Лаўшук, А. У. Бразгуноў, У. І. Мархель]. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – 341, [2] с. – Імянны паказальнік: Локун В. 131, 143, 152, 163, 171, 177, 187, 200, 211, 235, 241, 250, 258, 259, 264, 274, 281, 296, 310, 311.

182. **Новая книга филолога** // Заря. – 2006. – 6 января. – С. 8.

*«Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры» — новая кніга В. Локун.*

183. **Локун, В. И.** Корни прозы Василя Быкова / В. И. Локун ; интервью взял Семён Шапиро // Пінскі веснік. – 2006. – 20 студзеня. – С. 9.

*Беседа об истории создания и публикации монографии «Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры», а также о спонсорах проекта, благодаря которым книга появилась на свет.*

184. **Петрова, С.** Грамота ученой-пинчанке / Светлана Петрова // Пінскі веснік. – 2006. – 9 чэрвеня. – С. 1.

*Новость номера — В. И. Локун награждена грамотой Национальной академии наук Республики Беларусь и Института литературы им. Янки Купалы.*

185. **Область исследований** — литература // Заря. – 2006. – 17 июня. – С. 6.

*Валентина Локун — литературовед и литературный критик из Пинска награждена грамотой Национальной академии наук Республики Беларусь и Института литературы им. Янки Купалы.*

186. **Побединская, С.** И все-таки судьбою не обделена! / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2006. – 4 жніўня. – С. 1, 2.

*Юбилейная статья о жизненном и творческом пути В. И. Локун.*

187. **Праведник гуманистических идей,** проводник белорусского слова : медалью святой Евфросинии Полоцкой награждена пинчанка Валентина Локун — выпускница Брестского педагогического института имени А. С. Пушкина, кандидат филологических наук, член Союза писателей Беларуси // Заря. – 2006. – 8 августа.

188. **Андреева, Н.** Работать, сколько хватит сил / Надежда Андреева // Мясцовы час. – Баранавічы, 2006. – 10 жніўня. – С. 5.

*Про творчество В. Локун, которой 6 августа исполнилось 60 лет.*

189. **Ляшук, М.** Поздравили искренне и сердечно / Мария Ляшук // Пінскі веснік. – 2006. – 11 жніўня. – С. 2.

*О праздновании юбилея В. И. Локун.*

190. **Крэйдзіч, А.** Віншуем! / Анатоль Крэйдзіч // Літаратура і мастацтва. – 2006. – 18 жніўня (№ 33). – С. 3.

## 2007

191. **Побединская, С.** Имя Локун — в новом сборнике / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2007. – 12 студзеня. – С. 12.

*О статье В. Локун «Вобразна-жанравыя асаблівасці беларускага рамана 40-х – пачатку 50-х гадоў у кантэксце славянскіх літаратур» в сборнике «Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX стст.».*

192. **Гришковец, В.** Белорусская проза Валентины Локун : в издательстве «Беларуская навука» вышел академический сборник «Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX стст.» / Валерий Гришковец // Заря. – 2007. – 6 февраля.

193. **Побединская, С.** «Нёман» — городу над Пиной / Светлана Побединская // Пінскі веснік. – 2007. – 28 жніўня.

*О статье В. Локун «Пинщина литературная», опубликованной в восьмом номере журнала «Нёман», посвящённом 910-летию Пинска.*

## 2008

194. **Валянціна Локун** (нар. у 1946 годзе) // Літаратурная карта Берасцейшчыны / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, Кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства, Вучэбная літаратурна-краязнаўчая лабараторыя УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт» імя А. С. Пушкіна, Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі ; [рэдактар і ўкладальнік А. Крэйдзіч ;

рэдакцыйны савет: Л. А. Цупрык (старшыня) і інш.]. – Брэст, 2008. – С. 464–466.

195. **Кулажанка, Л.** Літаратурныя мясціны Беларусі / Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Святлана Сачанка ; ілюстрацыі з альбома Уладзіміра Ліхадзеева // Маладосць. – 2008. – № 2. – С. 116.

*Вёска Цепянец Бярозавіцкага сельсавета Пінскага раёна — радзіма Валянціны Локун.*

## 2011

196. **Крэйдзіч, А.** На трывалым падмурку / Анатоль Крэйдзіч // Маладосць. – 2006. – № 11. – С. 10–14.

*Аб пачатку дзейнасці Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам якога з'яўляецца літаратурны крытык В. Локун.*

197. **Ляшук, М.** Юбилей в кругу друзей / Мария Ляшук ; фото Вячеслава Ильенкова // Пінскі веснік. – 2011. – 12 жніўня.

198. **Юбилей** : [В. И. Локун] // Полесская правда. – Пинск, 2011. – 20 августа.

## 2012

199. **Локун Валентина Ивановна //** Ученые Пинщины / Пинский городской исполнительный комитет [и др. ; авторы-составители: И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий]. – Пинск, 2012. – С. 81.

200. **Федорович, В.** Василь Быков : новое о творчестве знаменитого писателя / Валерий Федорович // Пінскі веснік. – 2012. – 10 лютага.

*В книге «Васіль Быкаў: вядомы і невядомы» помещено литературоведческое эссе Валентины Локун «Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры».*

201. **Ильенков, В.** Пожелать земного счастья много… Валентина Ивановна Локун отмечена в особой номинации «За женское мужество» / Вячеслав Ильенков ; фото автора // Пінскі веснік. – 2012. – 13 сакавіка. – На фото: Диплом «Женщина года»

В. И. Локун вручает председатель горсовета депутатов, руководитель организации ОО «Белорусский союз женщин» Н. И. Кохнович.

202. **Анцух, Л.** «Заставацца сабой…» [Электронный ресурс] / Лилиана Анцух // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Мінск, 2012. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/pisateli/proza/zastavacca-saboj.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*В ближайшее время издательством «Четыре четверти» планируется выпуск книги о Владимире Гниломёдове «Заставацца сабой...». Книга приурочена к 75-летию автора и выходит в серии «Личность и время». Среди авторов сборника — Валентина Локун. Её статья называется «Проза Уладзіміра Гніламёдава: адраджэнне нацыянальнага эпасу».*

203. **Рублевская, Л.** О дрессировке дельфинов в сети [Электронный ресурс] / Людмила Рублевская ; фото: Виталий Гиль // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2012. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/11/878.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*О критике, литературе и интернете рассуждают главный редактор журнала «Маладосць» Светлана Денисова, доцент кафедры литературно-художественной критики Института журналистики БГУ Оксана Безлепкина и писатель-обозреватель Людмила Рублевская. С. Денисова так отозвалась о рецензии Валентины Локун на «Дзікі луг» Андрея Федоренко: «Тому, кто будет читать эту статью, обязательно захочется прочитать Федоренко».*

204. **Шатыренок, И.** Владимиру Гниломедову 75 лет [Электронный ресурс] / Ирина Шатырёнок // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2012. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/23/891.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*Книга из серии «Асоба і час» «Уладзімір Гніламёдаў: „Заставацца сабой...“» представляет собой сборник статей, рецензий, интервью, воспоминаний, опубликованных в разное время в минских, московских, киевских изданиях. Среди авторов сборника — Валентина Локун. Ее статья называется «Проза Уладзіміра Гніламёдава: адраджэнне нацыянальнага эпасу».*

## 2013

205. **Новиков, А.** Валянціна Локун: «Настальгія па страчанаму раю» [Электронный ресурс] / Александр Новиков // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2013. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/11/918.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*Каментарый рэцэнзіі В. Локун на аповесць А. Федарэнкі «Дзікі луг».*

206. **Новиков, А.** Несколько слов о «Нёмане» № 11-2013 [Электронный ресурс] / Александр Новиков // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2013. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/559/1377.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

Об *удивительном литературном портрете (в одноимённой рубрике) замечательного белорусского писателя, прозаика Олега Ждана (Пушкина), который создала Валентина Локун.*

207. **Новиков, А.** Целинные участки для литературной критики [Электронный ресурс] / Александр Новиков // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2013. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/11/1124.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*Михаил Поздняков, известный писатель и литературный чиновник, на вопрос «Назовите имена наиболее ярких современных отечественных критиков» на форуме «Рецензент — это критик в эпоху упадка литературы» в журнале «Нёман» называет в числе тех, кто активно и плодотворно работает, Валентину Локун и причисляет к лучшим её работы «Иван Шамякин: в поиске нравственного идеала» («Нёман» № 10 за 2003 г.) и «Проза Уладзіміра Гніламёдава» («Полымя» № 2 за 2009 г.).*

208. **Шатыренок, И.** Вспомним 2013 год [Электронный ресурс] / Ирина Шатырёнок // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2013. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/raznoe/1421.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

*«Продолжаю переписываться с литературоведом из Пинска Валентиной Локун, в чём-то с ней расхожусь, но по*

*большому счёту мы — единомышленники, смотрим на многие вопросы в современном литературном процессе почти одинаково, делимся впечатлениями о последних новинках, тревожимся и радуемся».*

## 2014

209. **Ляшук, М.** Когда чужая беда не чужда / Мария Ляшук ; фото Вячеслава Ильенкова // Пінскі веснік. – 2014. – 9 снежня.

*О посещении председателем Пинского горисполкома А. В. Мулярчиком семьи В. И. Локун в День инвалидов.*

## 2016

210. **Крэйдзіч, А.** Ад яе сыходзіла толькі светлыня : не стала літаратурнага крытыка Валянціны Локун / Анатоль Крэйдзіч // Літаратура і мастацтва. – 2016. – 24 чэрвеня (№ 25). – С. 3.

211. **Крэйдзіч, А.** Ад яе сыходзіла толькі светлыня : у мінулы чацвер, 16 чэрвеня, пайшла з жыцця выдатны літаратурны крытык, прыгожая жанчына і чалавек найвялікшай і найдабрэйшай душы Валянціна Локун / Анатоль Крэйдзіч // Народная трыбуна. – 2016. – 24 чэрвеня (№ 26). – С. 11.

212. **Локун Валентина Ивановна** : [некролог] / Пинский городской Совет депутатов, Пинский городской исполнительный комитет, редакция газеты «Пінскі веснік» // Пінскі веснік. – 2016. – 24 чэрвеня. – С. 3.

213. **Крэйдзіч, А.** Ад яе сыходзіла святло / Анатоль Крэйдзіч // Заря. – 2016. – 2 июля (№ 75). – С. 3.

214. **Утрата** // Полесская правда. – Пинск, 2016. – 2 июля. – С. 2.

215. **Шамякіна, А.** Жыццё як шчасце і выпрабаванне : літаратуразнаўцы Валянціне Локун споўнілася б 70 гадоў / Алеся Шамякіна // Літаратура і мастацтва. – 2016. – 5 жніўня (№ 31). – С. 5.

*Агляд жыцця і творчасці В. Локун.*

216. **У памяць зямлячкі** // Народная трыбуна. – 2016. – 18 жніўня. – С. 3.

*У Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшла вечарына, прысвечаная памяці знакамітай зямлячкі Валянціны Локун.*

217. **Дзенісовіч, І.** Якой была Валянціна Локун... / Ірына Дзенісовіч // Пінскі веснік. – 2016. – 19 жніўня. – С. 4.

*Аб вечарыне, прысвечанай памяці В. Локун, якая прайшла ў Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы.*

218. **Крэйдзіч, А.** Ад яе сыходзіла толькі светлыня [Электронны рэсурс] : не стала літаратурнага крытыка Валянціны Локун / Анатоль Крэйдзіч // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Мінск, 2016. – Рэжым доступа: https://litkritika.by/categories/pisateli/1326/3727.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

219. **Шамякіна, А.** Жыццё як шчасце і выпрабаванне [Электронны рэсурс] : літаратуразнаўцы Валянціне Локун споўнілася б 70 гадоў / Алеся Шамякіна // ЛіМ. – Мінск, 2016. – Рэжым доступа: http://zviazda.by/be/news/20160809/1470735586-zhyccyo-yak-shchasce-i-vyprabavanne. – Дата доступа: 13.02.2019.

220. **Шатыренок, И.** Прощальные слова. Памяти литературного критика Валентины Локун [Электронный ресурс] / Ирина Шатырёнок // ЛитКритика.by : Белорусский литературный портал. – Минск, 2016. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/pisateli/1326/4009.html. – Дата доступа: 13.02.2019.

## 2018

221. **Локун Валянціна Іванаўна** (06.08.1946–16.06.2016) // Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі / [складальнік Н. М. Парчук ; пад рэдакцыяй Т. А. Дземідовіч]. – Брэст, 2018. – С. 118–123.

222. **Славутыя землякі Піншчыны.** Валянціна Іванаўна Локун [Электронны рэсурс] // Полесская правда. – Пинск, 2018. – Режим доступа: http://www.pinsknews.by/?p=53300. – Дата доступа: 20.04.2019.

223. **Валянціна Іванаўна Локун** [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступа: https://be.wikipedia.org/wiki/Валянціна_Іванаўна_Локун. – Дата доступа: 22.04.2019.

# УЗНЯЦЦА ДА ЛЁСУ ЧАЛАВЕЧАГА
## Аўтабіяграфія

Нарадзілася я на Палессі — у невялічкай вёсачцы Цепянец, што на Піншчыне. Назва вёскі (па-руску Тепенец) хутчэй за ўсё паходзіць ад слова «топь», або багна, па-беларуску. Праўда, да сярэдзіны XX стагоддзя балоты крыху адступілі ад самой вёскі, але вады, асабліва па вясне, было шмат. Яна віравала не толькі ў ваколіцы, але і ў гародах, перакрывала дарогі. Трэба было доўга чакаць, пакуль яна ўступіць у зямлю, або сцячэ ў яшчэ больш нізкае месца. Затое, як прыгожа было напрыканцы красавіка ці на пачатку мая, калі цвіла чаромха, а пасля зацвіталі сады!

Нарадзілася я ў жніўні 1946 года. Час быў цяжкі, пасляваенны, галодны. Савецкая ўлада ў нас, заходнікаў, толькі-толькі ўсталявалася. Калгасы арганізоўвалі недзе ў 1949–1950-х гадах. Дзед, які яшчэ да Першай сусветнай вайны паехаў у Амерыку, каб зарабіць «капейку», вярнуўся на радзіму ў 1921 годзе не зусім бедным чалавекам. Зробленых даляраў хапіла, каб ажаніцца на сіраце, паставіць новую хату і прыкупіць некалькі дзесяцін зямлі. Толькі ўсё нажытае панішчыла вайна, удзень рабавалі немцы, а ўначы стукаліся ў вокны партызаны…

Не ведаю, якім чынам, але пасля вайны бацьку, які прыйшоў з фронту з цяжкім раненнем, удалося разжыцца канём. Які гэта быў прыгажун — на ўсю вёску! Бацька плакаў, калі яго забіралі ў калгас. І праўда, не пражыў конік галоднай зімы, загінуў па вясне. Не вельмі шыкавалі тады і людзі, якія набылі статус калгаснікаў.

Чытаць, па сутнасці, навучылася яшчэ да школы — у старэйшага брата, калі той рабіў урокі дома. Школа ў вёсцы была толькі пачатковая і мела ўсяго два невялічкія пакоі, у кожным з іх адначасова праводзіліся заняткі двух класаў. Але нічога, урокі праходзілі цікава, па-за ўвагай настаўніцы не заставаўся ніводны вучань.

Сваю першую настаўніцу амаль не памятаю, бо нешта вельмі мала яна прабыла, увогуле настаўніцы тады часта мяняліся. Цяпер цяжка сказаць, чаму яны ў нас не затрымліваліся. Я ж бегала ў сваю школу з задавальненнем. Вучоба давалася

лёгка, за ўсе чатыры гады навучання я атрымлівала адны толькі пяцёркі, калі чацвёркі і былі, то, можа, адна ці дзве.

Дарэчы, школа была і адзіным культурным цэнтрам. Праўда, з усіх мерапрыемстваў, як памятаю, тут было толькі адно: дэманстрацыя фільмаў. Раз у месяц, а мо і два, сюды прывозілі кіно. Якая ж гэта была радасць для нас — дзетвары! Ды і для дарослых таксама. Зразумела, што месцаў за партамі для ўсіх не хапала, і мы ўсаджваліся на падлозе. Мы не проста глядзелі фільм, мы ў ім саўдзельнічалі. Мы перажывалі за герояў, як за сваіх блізкіх. На добры тыдзень пасля хапала ўражанняў.

Сярэдняя школа была ў суседняй вёсцы Малоткавічы, за сем кіламетраў ад нашага Цепянца. Хадзілі туды, зразумела, пешшу. На гэта трэба было патраціць добрую гадзіну, а ў разводдзе ці непагадзь то і ўсе паўтары. Сталоўкі ў школе не было, пазней з'явіўся там нейкі маленькі буфет, але хадзіць туды не было як: мала ў каго з нас былі грошы. Усе мы былі дзяцьмі калгаснікаў.

Пасля шостага класа захварэла на ногі. Школу прыйшлося пакінуць. Марудна пацягнуліся дні ў розных бальніцах. Прадоўжыць вучобу змагла толькі праз тры гады — у Пінскай завочнай школе. Сёмы і восьмы класы здала за адзін год. А праз тры гады — у 1966 годзе — атрымала і атэстат — з залатым медалём.

Хацелася вучыцца далей. Апантана любіла кнігі. Чытаць магла суткамі. Але дзе было ў вёсцы тыя кнігі дастаць? У Цепянцы бібліятэкі не было, сябры прыносілі з Малоткавіч, з раённай бібліятэкі, па тым часе яна была прыстойна ўкамплектаваная. Адно дрэнна, там амаль адсутнічала замежная літаратура.

Рызыкнула падаць дакументы ў Брэсцкі педінстытут. Мне пашанцавала: там з разуменнем аднесліся да маёй заявы, і ў тым жа 1966 годзе я без уступных экзаменаў (адыграў сваю ролю залаты медаль) была залічана на першы курс філалагічнага факультэта завочнай формы навучання. Абрала, зразумела, рускае аддзяленне, бо ў праграме завочнай школы беларуская мова і літаратура лічыліся прадметамі неабавязковымі.

Студэнцтва… Гэта былі лепшыя гады ў маім жыцці! Нарэшце я была далучана да вялікай літаратуры. Усур'ёз

захапілася І. Тургеневым. Тады мы ўсе былі рамантыкамі. Марылі ратаваць чалавецтва ад гідры капіталізму. Мы праглі подзвігаў. І агульны пафас тэкстаў І. Тургенева быў сугучны маёй унутранай настроенасці. Я хацела быць адначасова такой, як Джэма і Адзінцова. Я цалкам падтрымлівала думку Базарава, што «прырода не храм, а майстэрня, і чалавек у ёй гаспадар». А мова І. Тургенева! Гэта ж сапраўдныя вершы ў прозе. Такой «празрыстай» і музыкальнай была проза хіба што яшчэ ў А. К. Талстога — аўтара «Князя Сярэбранага». А хто лепш за І. Тургенева мог адлюстраваць прыроду? Успомнім яго «Запіскі паляўнічага»! Адмаўляла Л. Талстога, лічыла яго абсалютным антыподам І. Тургенева. Асабліва ў вызначэнні ролі жанчыны ў грамадстве. Ці магла тургенеўская жанчына, мэтаскіраваная, барацьбітка па духу, ідэйна непахісная, адданая да скону аднаму каханаму, задаволіцца роллю жонкі і маці? Як Наташа Растова, якой так захапляецца Л. Талстой? Яшчэ і года не прайшло пасля смерці князя Балконскага, а яна нараджае ад П'ера Бязухава дзіця і пачувае сябе самай шчаслівай на зямлі. Л. Талстой абмяжоўваў сацыяльную сферу жанчыны сям'ёй, мацярынствам. І. Тургенеў жа ўводзіў у гэтую сферу грамадскія стасункі. Менавіта апошнія і вызначалі ў яго характар жанчыны.

І яшчэ пра кнігі. Чамусьці лічылася, што маёй настольнай кнігай з'яўляецца раман «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага. Такую думку найчасцей выказвалі журналісты. Гэта мяне заўсёды раздражняла. Ну які ж герой з Паўкі Карчагіна? Жыццё яго заганяла ўсё далей у вугал, а ён замест таго, каб годна пайсці ў іншы свет, працягваў за гэта жыццё чапляцца. Другімі словамі, Паўка не сам выбіраў свой лёс, ён толькі падпарадкоўваўся яму. Зусім іншае — Овад Э. Л. Войніч. Вось сапраўдны герой. Як той Сотнікаў будзе пасля ў В. Быкава. Овад сам выбраў свой жыццёвы шлях. Сам ставіў сабе задачу і ўмовы яе вырашэння. І пры гэтым ні на ёту не адступаў ад сваёй мэты-ідэі.

Мне заўсёды імпанавалі героі, моцныя духам, жыццядайныя, героі з высока ўзнятай галавой. З імі мне было цікава. Менавіта такіх я шукала і ў рэальным жыцці. І мне шчасціла, я іх знаходзіла. Ці, можа, сам лёс мне іх пасылаў.

У 1971 годзе атрымала дыплом настаўніцы, а разам з ім і характарыстыку-рэкамендацыю для паступлення ў аспірантуру

БДУ імя У. І. Леніна. Гэта быў першы выпадак у гісторыі Брэсцкага педінстытута, калі завочніцу рэкамендавалі ў навуку. Без ваганняў абрала кафедру рускай класічнай літаратуры. Планавалася, што даследаваць я буду тургенеўскую аповесць — жанравыя асаблівасці. Але, на жаль, акалічнасці склаліся такім чынам, што недзе праз год кафедру я вымушана была пакінуць. З гэтай нагоды нават прыязджаў тады да мяне дацэнт гэтай кафедры Аляксандр Аляксандравіч Станюта (пасля ў нас з Аляксандрам Аляксандравічам склаліся вельмі добрыя таварысцкія адносіны). Аляксандр Аляксандравіч прыехаў з прапановай заняцца даследаваннем беларускай літаратуры. Была нават дамоўленасць на гэты конт з кафедрай беларускай літаратуры. Толькі я не магла прыняць гэтай прапановы: я не ведала беларускай літаратуры. Ды і мовай беларускай я амаль не валодала.

Пачаўся ці не самы драматычны перыяд у маім жыцці. Усё, да чаго я так імкліва набліжалася, рухнула. Наперадзе ніякіх маякоў, ніякіх арыенціраў. Усё страчвала свой сэнс. Нават жыццё.

У 1974 годзе наша сям'я пераехала ў Пінск. Неўзабаве я пазнаёмілася з галоўным бібліёграфам гарадской бібліятэкі Феляй Аронаўнай Грантоўскай. Больш начытанага чалавека ў маім жыцці яшчэ не было. Як і больш блізкага мне па духу. Гэтая жанчына нібыта наноў адкрывала мне Гамера і Дантэ, Расіна і Вальтэра, Шылера і Гётэ, Т. Мана і Фейхтвангера, Рэмарка і Хэмінгуэя, Л. Талстога і Дастаеўскага… Пастунова наблізіліся мы і да беларускіх аўтараў: Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Чорны, І. Мележ, І. Шамякін, В. Быкаў, І. Чыгрынаў, Б. Сачанка… Я спасцігала новы для сябе свет — своеасаблівы, шматгалосы, шматфарбны, са сваёй адметнай гісторыяй, традыцыямі, філасофіяй. Паступова асвойвала і мову беларускую — найперш праз багацейшую на адценні прозу Я. Брыля, М. Стральцова.

У 1979 годзе я зноў паехала ў Мінск. Сустрэлася з шаноўнай Вольгай Васільеўнай Казловай. Яна пазнаёміла мяне з Таццянай Іванаўнай Шамякінай (намячалася нават тады, што Таццяна Іванаўна будзе маім навуковым кіраўніком). Пасля пэўных кансультацый акрэслілася і тэма дысертацыі: «Праблемы стылю беларускай ваеннай прозы» (на матэрыяле творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава).

Ваенную тэму абрала не выпадкова, гэта была найбольш распрацаваная плынь у развіцці савецкай літаратуры, «рэалістычна-псіхалагічная». У літаратуру ўлілося пакаленне франтавікоў, «лейтэнантаў». Яны прайшлі вайну, зведалі на ўласным вопыце акопную праўду і, наколькі гэта было магчымым па тым часе, намагаліся гэтую праўду данесці да чытача. Пры гэтым кожны з абраных пісьменнікаў меў свой вопыт вайны. Стылёва яны таксама былі адрознымі.

Праца мяне захапіла. Увесь першы год займалася экзаменамі. Здавала кандыдацкі мінімум. Пасля ўзялася за працу. Навуковым кіраўніком у выніку быў зацверджаны Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў — адзін з вядучых беларускіх літаратуразнаўцаў. Мяне можа зразумець толькі той, хто сам прайшоў школу Д. Бугаёва. Я вельмі ўдзячна лёсу, што ён звёў мяне з гэтым чалавекам. Тонкі аналітык, выдатны знаўца літаратуры, ён «ляпіў» з мяне даследчыка, вучыў не толькі «чытаць» чужыя тэксты, але і працаваць над сваімі.

Кандыдацкую дысертацыю абараніла ў чэрвені 1984 года. Ваенная проза стане, можна сказаць, галоўнай тэмай майго творчага жыцця.

Свой першы зборнік «Да новых вышынь» (Мінск, Мастацкая літаратура, 1991) я чакала амаль сем гадоў. Здавалася, што ён не выйдзе ўжо ніколі. І вось мой першынец з’явіўся… Кніга была прыхільна сустрэта чытачамі. Асабліва мяне парадавала рэцэнзія З. Мельнікавай, апублікаваная ў ЛіМе. Зоя Пятроўна дала досыць высокую ацэнку зборніку.

Большасць са змешчаных у зборніку артыкулаў была прысвечана «ваенным» творам В. Быкава, І. Чыгрынава, І. Шамякіна, Б. Сачанкі, В. Казько, Ю. Бондарава, В. Астаф’ева, В. Бялова і інш. Праўда, мяне цікавіў найбольш формастваральны, стылёвы бок мастацкіх дыскурсаў празаікаў.

Паступова акцэнты пачнуць мяняцца. Прыблізна з сярэдзіны 80-х гадоў мяне захапіла філасофія «ваеннай» прозы, канцэпцыя маралі, або «нравственности», па-руску. Вынікам гэтага захаплення стала манаграфія «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы. 1950–1960-я гады» (Мінск, Навука і тэхніка, 1995). Тут я значна пашырыла і кантэкст даследавання, звярнулася да канцэпцыі развіцця

эстэтычнай думкі рускай літаратуры (Р. Бакланаў, К. Сіманаў, Ю. Бондараў, В. Кандрацьеў, Б. Васільеў…).

Прыцягвала кампаратывістыка. Гэтаму садзейнічала, зразумела, і мая праца ў аддзеле літаратурных узаемасувязей Інстытута літаратуры НАН Беларусі. Параўнальнае літаратуразнаўства вымагае ад даследчыка шырокіх паралеляў, можна сказаць, глыбінных ведаў іншых літаратур — еўрапейскай, сусветнай. Але ж гэта так цікава! Цікава і адказна. Мы выходзілі за межы існуючай канцэпцыі нацыянальных літаратур Савецкага Саюза, выходзілі на еўрапейскую культурную прастору. Набліжалася новае тысячагоддзе. Адбывалася змена культурнай парадыгмы. Мы павінны былі не толькі па-новаму прачытаць еўрапейскую літаратуру, але і адкрыць сябе Еўропе і ўсяму свету. Адкрыць дастойна. На роўных. У гэтым плане ўсё было ўпершыню, усё было новым — ад падыходаў да методык. Ніводная з нацыянальных літаратур не можа развівацца аўтаномна, яна бачнымі ці нябачнымі ніцямі, але абавязкова звязана з агульным літаратурным працэсам. Гэта датычыць і літаратуры беларускай — самабытнай па сутнасці і гістарычнаму развіццю. Яна таксама прайшла ўсе этапы агульнаеўрапейскага развіцця. Паскорана, «пункцірна», але прайшла. Можна знайсці ў ёй адзнакі і сентыменталізму і рамантызму, і мадэрнізму.

Усё часцей узнікала думка заняцца літаратурай «згубленага пакалення» і экзістэнцыяльнай прозай — прозай складанай, супярэчлівай, метафарычнай, а перад усім філасофскай. Ф. Дастаеўскі, А. Камю, Ж.-П. Сартр — яны ж найперш філосафы, а пасля ўжо мастакі. Толькі ў жыцці часта атрымліваецца зусім не так, як мы плануем.

Віктар Антонавіч Каваленка, дырэктар Інстытута, а на той час яшчэ і загадчык аддзела літаратурных узаемасувязей, уключыў мяне ў склад аўтарскага калектыву для напісання «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя». Яна выйшла пасля ў 4 тамах у выдавецтве «Беларуская навука» (1999–2002). Чатыры гады я працавала над «Гісторыяй». Напісала тры раздзелы: Іван Шамякін, Алесь Асіпенка, Уладзімір Дамашэвіч. У 2014 годзе ўбачыла свет кніга 3-я 4-га тома, дзе быў змешчаны мой раздзел «Валянціна Коўтун» (с. 704–736).

Разам з гэтым падрыхтавала да друку яшчэ адзін зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Кругі жыцця, кругі

літаратуры», які быў выдадзены ў 2002 годзе (Мінск, ГА БАКК). У зборніку закранаюцца актуальныя для таго часу праблемы развіцця беларускай прозы.

Літаратура відавочна здавала свае ранейшыя высокія пазіцыі. Як і напачатку стагоддзя, яна была ўцягнена ў палітычныя дыскусіі. Роля творцы дэвальвавалася. У такі вось няпросты час я з блаславення таго ж Віктара Антонавіча і распачала свой галоўны праект: «Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры».

Так, В. Быкаў быў беларускім савецкім пісьменнікам, адным з лепшых на савецкай літаратурнай прасторы. Але пры гэтым ён заставаўся і пісьменнікам нацыянальным, нацыянальным па светаўспрыманні, па сакралізацыі духу сваіх герояў. Але ж ён пісьменнік і еўрапейскага кшталту — па глыбіні і маштабах адлюстравання «я» чалавека, па маштабах думкі, аўтарскай занепакоенасці пра будучы свет. Праблема свабоды і права выбару былі цэнтрам філасофіі экзістэнцыялістаў. Вакол гэтага цэнтра будаваў сваю філасофскую сістэму і В. Быкаў: аповесць «Сотнікаў», «Дажыць да світання», «Абеліск», пасля будзе «Аблава» і, нарэшце, «Ваўчыная яма», апавяданні «Сцяна», «Труба» і г. д. Другімі словамі, В. Быкава 70-х і 90-х гадоў хвалявалі тыя ж пытанні, што і Ф. Дастаеўскага другой паловы XIX стагоддзя, А. Камю і Ж.-П. Сартра першай паловы XX стагоддзя. Дарэчы, усе яны, у тым ліку і В. Быкаў, ахвотна карысталіся метафарай, алегорыяй, прытчай, ствараючы свае адмысловыя коды рэальнага жыцця. Што датычыць літаратуры «згубленага пакалення», тут таксама можна знайсці цікавыя паралелі: той жа Рыбак, скажам, або Антон Галубін. Хоць у цэлым бліжэй да вопыту Э. М. Рэмарка і Р. Олдзінгтона стаіць у нас М. Гарэцкі, («На імперыялістычнай вайне»), пазнейшая «афганская» літаратура. Вядома, што В. Быкаў высока ацэньваў творчасць Э. Хэмінгуэя. Беларускі пісьменнік пісаў аб сваёй вайне ўзбагачаны ўжо мастацкім вопытам амерыканскага празаіка. Параўнаем «Альпійскую баладу» і «Па кім звоніць звон».

Манаграфія прайшла ўсе этапы абмеркавання ў Інстытуце і была рэкамендавана да друку ў выдавецтве «Беларуская навука». Толькі, на жаль, фінансавае становішча Інстытута не спрыяла рэалізацыі гэтага праекта. Кніга пабачыла свет толькі ў 2005 годзе ў недзяржаўным выдавецтве «Тэхнапрынт». Яна была выдадзена

накладам усяго 200 асобнікаў і, такім чынам, не атрымала шырокага распаўсюджання ў навуковых колах краіны. Не было на яе і друкаваных водгукаў. Але яе прачыталі і далі высокую ацэнку такія аўтарытэтныя вучоныя, як У. Гніламёдаў, М. Тычына, Д. Бугаёў, Л. Гаранін, паспеў прачытаць яе ў рукапісе і парадавацца за мяне В. Каваленка, а А. Мальдзіс нават перадаў адзін экзэмпляр манаграфіі ў Лондан, у бібліятэку імя Ф. Скарыны.

Галоўная кніга была напісана. Тым не менш нешта мяне трывожыла, не задавальняла, і неўзабаве я зразумела што — незавершанасць тэмы вайны, няма генеалогіі, вытокаў. Дасюль я займалася найперш тыпалагічнымі сувязямі. А існуюць яшчэ і традыцыі, генетычныя сувязі, якія робяць літаратурны працэс непарыўным. Агульналітаратурныя метады і накірункі сінтэзуюцца з нацыянальнымі традыцыямі, індывідуальнымі асаблівасцямі мастака — працэс развіцця літаратуры паўстае, такім чынам, як жывы арганізм.

Ваенная проза мела адметную генетыку: «Пармскі манастыр» Стэндаля, «Барадзіно» М. Лермантава, «Вайна і мір» Л. Талстога. «Вайна і мір» — «выток» агульны для ўсёй славянскай літаратуры, ды што славянскай — еўрапейскай, сусветнай. У аснову даследавання я паклала канцэпцыю гісторыі і чалавека. Дадала сюды яшчэ ўкраінскую ваенную прозу першай паловы XX стагоддзя. Уключыла ў даследаванне працы рускіх філосафаў М. Бярдзяева, М. Фёдарава, А. Хамякова. Пісалася лёгка. У выніку атрымаўся зусім нядрэнны нарыс. Пасля ён быў уключаны ў кнігу «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей». Кніга была выдадзена ў 2002 годзе ў выдавецтве «Беларуская навука». У 2003 годзе «Нарысы» былі перакладзены на ўкраінскую мову. Яны атрымалі досыць высокую ацэнку ў навуковых колах Беларусі і Украіны, і ў 2004 годзе некаторыя з аўтараў — Ж. Шаладонава, У. Мархель і я, — сталі лаўрэатамі прэміі прэзідэнтаў Акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы. Як было адзначана ў дыпломе: «За выполнение научно-исследовательской работы „Культурно-исторические белорусско-украинские связи: литературно-языковой аспект“».

Цяпер можна было ўжо і паставіць апошнюю кропку ў маёй тэме вайны. Здаецца, я гэтую тэму вычарпала. Спачатку былі ўзаемасувязі і ўзаемаўплывы беларускай і рускай літаратур, пасля

беларуска-руска-ўкраінскія «паралелі», была, нарэшце, паралель беларуска-нямецка-англійска-французска-амерыканская… Але нашаму аддзелу была прапанавана тэма славянскіх літаратур, і я ў сувязі з гэтым абрала наступны аспект: «Вобразна-жанравыя асаблівасці беларускага рамана 40-х – пачатку 50-х гадоў у кантэксце славянскіх літаратур». А гэта зноў вайна. Я даследавала беларускі раман (К. Чорны, М. Лынькоў) у параўнанні з раманам чэшскім (М. Пуйманава, К. Шульц), балгарскім (Д. Дзімаў) і польскім (В. Журкоўскі, Е. Путрамент, Б. Чэшка, М. Дамброўская, З. Налкоўская). Праца была ўключана ў калектыўную манаграфію «Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX стст.» (Мінск, Беларуская навука, 2006).

Вось цяпер, здаецца, мая вайна скончылася канчаткова.

Жывучы ўбаку ад сталічных тусовак, я па магчымасці старалася не прапусціць ніводнага больш-менш значнага твора. З сучасных аўтараў з цікавасцю сачыла (гэта пра памерлых) і сачу (пра жывых) за творчасцю У. Караткевіча, В. Адамчыка, В. Карамазава, В. Казько, В. Коўтун, С. Алексіевіч, А. Казлова, Ю. Станкевіча, А. Федарэнкі і г. д. Спіс можна доўжыць. Недаравальна мала ў нас напісана пра Віктара Казько. Гэта пісьменнік унікальнага творчага дыяпазону, у тэкстах якога сінтэзаваліся, здаецца, усе плыні і жанры. Яго проза ўмяшчае столькі філасофіі, столькі чалавечага болю, што дзіву даешся. Шкада, што дасюль ніхто з навукоўцаў усур’ёз не зацікавіўся яго творчасцю.

Над чым бы я ні працавала, заўсёды «азіраюся» на працы Дзмітрыя Якаўлевіча Бугаёва і Віктара Антонавіча Каваленкі (на жаль, заўчасна пакінуўшага нас). Гэта школа, куды хочацца вяртацца зноў і зноў. Не прапускаю артыкулаў М. Тычыны — вельмі сур’ёзны даследчык, сапраўдны прафесіянал. З цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаю той час, калі ён працаваў загадчыкам нашага аддзела ў Інстытуце. З цікавасцю чытаю У. Конана, П. Васючэнку, Т. Шамякіну, Я. Гарадніцкага, І. Штэйнера, І. Афанасьева, Г. Кісліцыну, І. Шаўлякову, А. Галубовіча.

Маю больш за 100 навуковых публікацый. Пішу артыкулы па праблемах развіцця нацыянальнай літаратуры, рэцэнзіі, аглядныя артыкулы, эсэ, нарысы, прадмовы і г. д. Друкавалася часцей за ўсё ў часопісах «Полымя», «Нёман», у газеце «Літаратура і мастацтва», а таксама ў розных зборніках. Двойчы

была лаўрэатам прэміі часопіса «Полымя»: у 1993 годзе за артыкул «У пошуках маральнага ідэалу. Проза Уладзіміра Караткевіча» (№ 6) і ў 2001 — за артыкул «Узняцца да лёсу агульначалавечага» (Талстоўскія традыцыі ў развіцці беларускай ваеннай прозы) (№ 5).

Працоўная біяграфія: працавала загадчыкам Цепянецкай бібліятэкі (1972–1974), старшым выкладчыкам Брэсцкага педінстытута імя А. С. Пушкіна (1985–1998). З 1987 па 2007 год — навуковым, старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з 1987 па 1998 год сумяшчаючы працу ў Інстытуце літаратуры з працай ў педінстытуце.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1998), з 2006 года член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Узнагароджана медалём Святой Еўфрасінні Полацкай — ад грамадскага аб'яднання «Міжнародны Фонд Святой Еўфрасінні Полацкай» — за вялікую асветніцкую дзейнасць, а таксама за актыўны ўдзел у рабоце Фонду з мэтай распаўсюджання ідэй хрысціянскага высокага духу, хрысціянскай маралі, заснаванай на дабрыні і міласэрнасці.

Пішу на беларускай і рускай мовах.

Жыву ў Пінску.

*В. І. Локун* *Май 2009 года*

# ПЯЦЬ ПАПЯРОВЫХ ЛІСТОЎ: ВАЛЯНЦІНА ЛОКУН — ШЧЫРАЯ ПРАЦАЎНІЦА ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫКІ

Валянціна Іванаўна — з кагорты спакойных і сціплых людзей, якія ўмеюць радавацца чужым здабыткам, чужым поспехам, бачаць у асобе таго ці іншага пісьменніка, калегі добрае і светлае. Як мне падаецца, для літаратурных крытыкаў гэтая рыса носіць надзвычайную каштоўнасць. Гэта мне асабліва імпаніравала ў Валянціне Іванаўне. Перачытваючы лісты Валянціны Іванаўны, згадваеш ужо не аднойчы выказанае пра тое, што калі і крытыкуеш, калі бачыш заганы, то пастарайся сканцэнтравацца над тым, а як палепшыць, як выправіць... Галоўнае ж — не цвік забіць, не раструшчыць і знішчыць кагосьці, а галоўнае — і пісьменніка, і чытача падвесці да думкі, што павінна быць у літаратуры, а ад чаго трэба пазбаўляцца, да чаго нельга апускацца...

У 1995 годзе ў мінскім выдавецтве «Навука і тэхніка» (цяпер выдавецтва носіць іншую назву — «Беларуская навука») пабачыла свет невялікая кніга Валянціны Локун «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы». У анатацыі можна было прачытаць: «Даследуецца змест беларускай прозы на тэму вайны і гістарычнага мінулага беларускага народа (У. Караткевіч) у пошукавым маральна-філасофскім аспекце. Разглядаюцца творы Я. Брыля, В. Быкава, А. Адамовіча, І. Навуменкі, І. Шамякіна, І. Чыгрынава і іншых пісьменнікаў у суаднясенні з развіццём эстэтычнай думкі ў рускай савецкай прозе.

Разлічана як на літаратуразнаўцаў, так і чытачоў, якія цікавяцца праблемамі сучаснай беларускай літаратуры».

У той час я нічога не чуў пра Валянціну Іванаўну Локун. Не ведаў, што жыве яна ў Пінску. Тады не было яшчэ Інтэрнэта, не было Вікіпедыі… Гэта зараз можна зазірнуць у сеціва і прачытаць пра тое, што цябе цікавіць…

У той даўняй маёй рэцэнзіі 1996 года «Маральны выбар» на зборнік «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы» я напісаў некалькі невялікіх заўваг пасля

знаёмства з манаграфіяй: «Караткевіч усё ж такі рамантык. Рамантык у адлюстраванні мінуўшчыны, рамантык у спраўджванні маральнасці. Ці да такой ступені рамантычнае і ідэалістычнае наша жыццё? У тым ліку — жыццё народа ў мінулым? Думаецца, пры аналізе твораў У. Караткевіча трэба больш аб'ектыўна ставіцца да абуджанай мастаком сівой мінуўшчыны. Аднак высноваў, накшталт наступнай, зробленых В. Локун, для сапраўднага аналізу творчасці нашага класіка недастаткова: „Праз мастацтва адбываецца ў чалавека і далучанасць да магутнай энергіі продкаў. Бо яно ўпітвае ў сябе геній усяго чалавецтва і гэтым аказвае ачышчальны ўплыў на душы пакалення“. Гэта ўсяго толькі агульная схема.

Як і ў першых двух раздзелах, так і ў трэцім аўтар даследавання закранае праблему эстэтычнага вымярэння маральна-філасофскіх пошукаў літаратуры. Таму, пэўна, у высновах літаратуразнаўцы і пераважае клопат пра прыгожае. Але ці дрэнна гэта? Галоўнае — у эстэтычным пошуку не згубіць адчуванне „зямлі пад нагамі“».

Так, тады ў сярэдзіне 1990-х я нічога не ведаў пра тое, што ў беларускім літаратуразнаўстве, літаратурна-мастацкай крытыцы працуе зусім абезрухоўлены чалавек, жанчына, якая зусім не выходзіць з дому.

Прайшоў некаторы час. У 2007 годзе «каманда» рэдакцыі часопіса «Нёман» прыехала на сустрэчу з чытачамі ў Пінск. Усім вядома, што горад над Пінай — не шэраговы раённы цэнтр… І ў тую паездку мы шмат чаго цікавага ў Пінску адкрылі. Асабіста я ўзбагаціўся новымі знаёмствамі. І быў вельмі ўсцешаны размовамі з паэтамі, празаікамі, якія стала жывуць у Пінску. Мне падалося, што менавіта ў гэтым правінцыйным гарадку склалася сапраўднае культурнае, асветніцкае «гняздо». Менавіта тады ўсёй грамадой мы наведаліся і да Валянціны Іванаўны Локун. Вуліца Першамайская, дом 136, кватэра 6…

Жыла яна на той час з братам, таксама інвалідам. Сутнасць іх невылечнай хваробы міапатыі была ў тым, што паступова атрафіраваліся мышцы. З 1991 года ён таксама перастаў хадзіць, але наколькі яму дазваляла здароўе, ва ўсім дапамагаў сястры. Даглядалі іх абодвух старэнькая маці ды яшчэ замацаваны за сям'ёю двух інвалідаў сацыяльны работнік.

Цяжка пераказаць тагачаснае ўяўленне пра Валянціну Іванаўну. Усё адно як перад табой сядзела кволае дзіця, захутанае ў нейкую вопратку, накрытае пледам. Не памятаю тых некалькіх гадзін размовы. Мусіць, мы гаварылі пра магчымае асобнае выданне яе манаграфіі пра творчасць народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Цікавілі мяне і іншыя творчыя планы Валянціны Іванаўны. Хаця пра ўсё пытаўся я вельмі асцярожна, баючыся праявіць адсутнасць такту.

А з тае сустрэчы мы пачалі даволі актыўна кантактаваць, перазвоньвацца. Пазней ліставаліся і праз электронную пошту. А з папяровай пошты ў мяне захавалася пяць лістоў літаратуразнаўцы з Пінска.

Ліст ад 11 лістапада 2007 года:

*«Шаноўны Алесь Мікалаевіч! Дасылаю Вам рэцэнзію на Южыка. Раман нядрэнны, але над характарам галоўнага героя я б яшчэ папрацавала, рыхтуючы кнігу да друку. Алесь Мікалаевіч, а якое рашэнне Вы прынялі наконт майго Быкава? Ці ёсць надзея на перавыданне? Адначасова з рэцэнзіяй на М. Южыка скончыла і артыкул „Проза Уладзіміра Гніламёдава“. Дамовілася з М. Мятліцкім, ён абяцаў гэты артыкул надрукаваць у „Полымі“. А ў лютаўскі нумар яны даюць мой матэрыял пра раман В. Коўтун „Пакліканыя“.*

*Зараз чытаю манаграфію І. С. Скарапанавай „Русская постмодернистская литература: новая философия, новый язык“. Ну, скажу я Вам, і эквілібрыстыка...*

*Думаю пра В. А. Каваленку — пачуццяў шмат, а слоў пакуль няма. Не магу вызначыцца з мовай. Напэўна, лепш усё ж такі на беларускай. Няхай сабе і постфактум, але віншую Вас з узнагародай — Граматай ад Пінскага гарвыканкама. Вельмі рада і за Вас, што Вы прычыніліся да нашага свята, і за нашыя ўлады, якія адпаведна ўсё гэта ацанілі.*

*Вось, здаецца, і ўсё. Дзякуй вялікі за турботы. Калі што якое — пішыце, або звaніце...*

*Усяго Вам найлепшага! Валянціна Локун. 11. 11. 2007 г.*

*P. S. Рэцэнзію мы запісалі і на дыск, я Вам яго таксама высылаю.*

*З надыходзячым Новым годам Вас! (Подпіс)».*

Рэцэнзія на кнігу Валянціны Коўтун «Пакліканыя» пад назвай «Пакліканыя і абраныя. Узыходжанне пісьменніцы» выйшла ў часопісе «Полымя» — у другім нумары за 2008 год. А вось артыкул «Проза Уладзіміра Гніламёдава» – толькі ў другім нумары за 2009 год.

Наступны ліст — ад 29 чэрвеня 2009 года:

*«Паважаны Аляксандр Мікалаевіч! Атрымала Ваша пісьмо. Дзякуй вялікі за тыя словы падтрымкі, што Вы мне напісалі. Я разумею, сітуацыя цяпер склалася вельмі неспрыяльная, каб выдаваць кніжкі, — але яна менавіта такая (падкрэслена Валянцінай Іванаўнай — А. К.) ужо не адно дзесяцігоддзе. Аб дзяржаўнай падтрымцы мы, здаецца, яшчэ доўга будзем марыць. Ну, але як будзе — так і будзе.*

*Мы тут з Марыяй Іванаўнай таксама зрабілі адзін „захад“, калі ў нас нешта атрымаецца, я Вам абавязкова паведамлю.*

*Цяпер адносна маёй аўтабіяграфіі. Аляксандр Мікалаевіч, я яе напісала і адправіла Вам па электроннай пошце яшчэ недзе на пачатку чэрвеня (падкрэслена Валянцінай Іванаўнай — А. К.). Пасля званіла ў прыёмную, мне паведамілі, што яе адразу перадалі Мінзеру (здаецца, такое прозвішча я пачула). Так што мая аўтабіяграфія даўно ў Вас. Праўда, не ведаю, як яе ўспрыме чытач, бо я ўсё ж больш навуковец, чым пісьменнік. Пісаць „прыгожа“ ў мяне не вельмі атрымліваецца. Няма пакуль фотакартачкі. Трэба неяк адважыцца і зрабіць яе.*

*Вось і ўсё. Дзякуй за пісьмо. З павагай да Вас Валянціна Локун. 29. 06. 2009».*

З асобным выданнем манаграфіі пра В. Быкава ўсё ніяк не атрымлівалася. Праўда, пазней у скарочаным выглядзе тэкст працы В. Локун увойдзе ў зборнік «Васіль Быкаў: вядомы і невядомы», які пабачыць свет у 2011 годзе ў выдавецтве «Літаратура і Мастацтва». У адзін зборнік з успамінамі Анатоля Сульянава, які па-сапраўднаму сябраваў з Васілём Уладзіміравічам.

Што да Марыі Іванаўны, то літаратуразнаўца мела на ўвазе Марыю Ляшук — галоўнага рэдактара пінскай гарадской газеты «Пінскі веснік». Яна (сама — таленавітая журналістка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі) якраз і была з тае кагорты пінчукоў,

хто заўсёды адгукаўся на просьбы Валянціны Іванаўны, хто не мінаў яе кватэры ў markdownрознае надвор'е, пры розных трывогах і клопатах. Зараз вось нават і падумалася: а чаму б людзям (у першую чаргу — журналістам, літаратарам), якія добра ведалі Валянціну Іванаўну, не скласці кнігу ўспамінаў пра літаратуразнаўцу?!.

Аўтабіяграфію ж сваю Валянціна Локун, відаць, пісала па майму запыту. У рэдакцыйна-выдавецкай установе «Літаратура і Мастацтва» толькі што пабачыў свет укладзены Мікалаем Несцеравічам Мінзерам зборнік аўтабіяграфій «З росных сцяжын». Ён узнік з выдавецкай ініцыятывы прадоўжыць колішнюю выдавецкую традыцыю, калі літаральна адзін за другім былі выдадзены тры зборнікі аўтабіяграфій літаратараў — «Пяцьдзесят чатыры дарогі», «Пра час і пра сябе», «Вытокі песні».

Кніга«З росных сцяжын», якая працягнула «праект» амаль праз чатыры дзесяцігоддзі, выклікала шырокі розгалас. Былі рэцэнзіі. І ў выдавецтва, і ў Мікалая Мінзера як укладальніка было жаданне прадоўжыць своеасаблівую серыю. Так мы пачалі збіраць пятую кнігу аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў і таксама выдаць, але не атрымалася. А кніга сабраная… Рукапіс яе ёсць, ляжыць, на вялікі жаль, без руху.

З ліста Валянціны Іванаўны Локун ад 24 жніўня 2009 года:

*«Шаноўны Аляксандр Мікалаевіч!*

*Атрымала ад Вас ліст, карэктуру крышку раней, а вось сёння трымаю ў руках і „Полымя“. Артыкул мой прадстаўлены вельмі і вельмі дастойна.*

*Дзякуй Вам вялікі! За ўсё! За тое, што парупіліся, знайшлі час (падкрэслена Валянцінай Іванаўнай — А. К.) і даслалі карэктуру, за высокую ацэнку маёй працы і ўвогуле за падтрымку.*

*Згодна з Вамі: калі б ВАК падтрымаў Вашу ініцыятыву і „Полымя“ набыло новы статус, — гэта толькі б садзейнічала папулярызацыі часопіса. Там можна знайсці досыць сур'ёзныя артыкулы, а калі крышачку ўзмацніць патрабаванні да аўтараў, дык усё будзе як трэба. „Акадэмізм“ часопіса вядомы даўно. Навуковы ўзровень высокі. Будзем спадзявацца…*

*Дай Вам Бог здароўя, Аляксандр Мікалаевіч, усяго Вам самага найлепшага! А крыўдаваць я на Вас не магу, Вы робіце, што можаце, што ў Вашых сілах.*

*З павагай і ўдзячнасцю Валянціна Локун».*

«Полымя», на шчасце, стаў ВАКаўскім часопісам. Дзякуючы найперш руплівасці галоўнага рэдактара «Полымя» Міколы Міхайлавіча Мятліцкага. Ён і з літаратуразнаўцамі сяброўства ладзіў, і шмат што зрабіў для пашырэння сувязяў выдання з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. У «Полымі» з нарысамі, артыкуламі выступалі не толькі вучоныя-літаратуразнаўцы, але і гісторыкі, эканамісты.

У «Літаратуры і Мастацтве», дзякуючы і добрым сувязям з брэсцкімі бібліятэкарамі, найперш — з работнікамі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, з тагачасным кіраўніцтвам кніжнай скарбніцы — дырэктарам Тамарай Паўлаўнай Данілюк і яе намеснікам Алай Міхайлаўнай Мяснянкінай, склалася атмасфера сапраўднай прыязнасці да творчасці пісьменнікаў Берасцейшчыны. Як вынік — былі выдадзены кнігі «Літаратурная Берасцейшчына» В. Ляшук і Т. Снітко, зборнікі прозы, паэзіі, перакладаў Валерыя Грышкаўца, Рышарда Капусцінскага, Анатоля Бензерука, Ніны Мацяш, Аляксандра Паплаўскага, Аляксандра Валковіча, Валерыя Гапеева, Анатоля Гладышчука, Зінаіды Дудзюк… Так і склалася з 2007 па 2011 гады сапраўдная «брэсцкая бібліятэка». Але шмат чаго і не ўдалося рэалізаваць. І сёння надзвычай шкадую, што не выдалі асобныя кнігі і Валянціны Локун, і Генадзя Праневіча…

Наступных два лісты — з 2012 года. Чытаю пісьмо ад 24 мая 2012 года:

*«Паважаны Алесь Мікалаевіч! Як і абяцала, пішу „ад рукі“. На жаль, камп’ютар, інтэрнэт і мабільнікі скора зусім адвучаць людзей ад ручкі і ліставанняў, а ўсе нашы рукапісы змесяцца на адной флэшцы. Такі час…*

*Цяпер пра Мальдзіса. Сказаць, што мы з ім добра знаёмыя, будзе перабольшаннем. Прафесар Мальдзіс быў для мяне вышынёй недасягальнай. Ды і творчыя нашы інтарэсы ішлі рознымі накірункамі. Ён шмат і плённа шчыраваў на ніве беларусістыкі. Ён адкрываў свету — спачатку славянскаму, а пасля і астатняму — беларускую літаратуру, а разам з гэтым*

*знаёміў, таксама адкрываў нам, славянскую культуру, карані, гісторыю гэтай культуры. Мальдзіс як творца, навуковец — асоба ўнікальная, маштабная ў сваёй творчай і „геаграфічнай“ зацікаўленасці. Такі (падкрэслена Валянцінай Іванаўнай — А. К.) Мальдзіс у нас адзіны, побач з ім паставіць няма каго, роўных яму не бачу.*

*Асабіста з Адамам Іосіфавічам мяне пазнаёміў Мікола Чырскі (працуе ў сферы турызму, краязнавец). Гэта дзякуючы яму, Чырскаму, выйшла мая манаграфія пра В. Быкава. Чырскі яе і распаўсюджваў у Мінску. Некалькі экзэмпляраў перадаў Адаму Іосіфавічу, якога добра ведаў. А. І. прачытаў, яму спадабалася, і адну кніжку па сваіх каналах ён перадаў у Лондан, у скарынінскую бібліятэку. У сувязі з гэтым, а пасля і з нагоды майго юбілею, А. І. прысылаў мне паштоўкі. Вось і ўсе нашы ліставанні.*

*Што датычыць маёй рэцэнзіі, то яе гісторыя такая. Быў канец 80-х – пачатак 90-х гадоў. Я працавала над гістарычнай прозай У. Караткевіча (мая манаграфія „Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы“. – Мн., 1995). Тады толькі прыступала да прачытання творчасці У. Караткевіча. У гэты ж час з’явілася і кніга А. Мальдзіса „Жыццё і ўзыходжанне Уладзіміра Караткевіча“ (Мн., 1991). Кніга мяне зацікавіла, вось я і напісала рэцэнзію „Быў, ёсць і буду…“, якая была змешчана ў „Полымі“ (№ 3, 1992). Гэта было першае (падкрэслена Валянцінай Іванаўнай — А. К.) і, што таксама вельмі важна, наватарскае (падкрэслена Валянцінай Іанаўнай — А. К.) прачытанне Мальдзісам творчай і жыццёвай біяграфіі вялікага Творцы. А. Мальдзіс па сутнасці першым (падкрэслена В. Локун — А. К.) адкрыў нам У. Караткевіча ў працэсе яго творчага развіцця, у развіцці яго складана-багатых стасункаў са светам. Адкрыў Асобу.*

*Ці глядзелі Вы мой рукапіс, дасланы Але Генрыхаўне? Мне здаецца, было б нядрэнна паяднаць Быкава і экзістэнцыяльную літаратуру з праявамі постмадэрнізму ў сучаснай літаратуры — літаратуры XXI ст.*

*Як Вам мая ідэя, Алесь Мікалаевіч?*

*Прыцягвае мяне яшчэ адна тэма — філасофія адзіноты (одиночества), але ніяк не магу падступіцца, часу не падбяру. Для*

*„Полымя“ напісала зноў пра У. Дамашэвіча, паставіла ўжо апошнюю кропку. У „Нёман“ адправіла рэцэнзію на манаграфію Мікуліча „Паэзія Заходняй Беларусі (1922–1939 гг.)“. Зараз працую над калектыўнай манаграфіяй „Літаратурная карта Еўропы“ і г. д. Пішыце, ці тэлефануйце, Алесь Мікалаевіч. Мой элект. адрас…».*

…Зазірнуў у свой электронны архіў. Там захавалася некалькі дзясяткаў, мо нават каля сотні, лістоў ад Валянціны Іванаўны Локун, а пасля яе смерці мы яшчэ некаторы час ліставаліся з яе братам — Васілём Іванавічам Локунам. Але гэта ўжо — асобная гісторыя. І, можа быць, з яе яшчэ вырасце некалі іншы аповед.

А ў нашай папяровай з Валянцінай Іванаўнай перапісцы быў яшчэ і пяты ліст — ад 2 жніўня 2012 года. Вось яго і цытую напрыканцы свайго нядоўгага ўспаміну:

*«Паважаны Алесь Мікалаевіч! Ваша пісьмо атрымала. Дзякуй вялікі…*

*А цяпер наконт Вашай прапановы напісаць артыкул пра творчасць Алены Брава. Тэксты гэтай пісьменніцы мне падабаюцца, нешта пра іх я ўжо недзе і пісала. Думаю, артыкул у мяне атрымаецца і лепей за ўсё было б яго надрукаваць у „Нёмане“, каб і рускамоўны чытач пазнаёміўся з гэтай цікавай пісьменніцай. Але канкрэтна аб гэтым я пазней з Вамі пагавару.*

*На вялікі жаль, Алесь Мікалаевіч, я не магу даслаць Вам сваёй манаграфіі „Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы“, бо ў мяне застаўся яе толькі адзін экзэмпляр. Кніжка была выдадзена ў выдавецтве „Навука і тэхніка“, калі я працавала ў Інстытуце літаратуры, мне тады Віктар Антонавіч Каваленка пераслаў некалькі аўтарскіх экзэмпляраў і больш я іх не мела магчымасці набыць. І апошняе…».*

Неяк няёмка цытаваць апошнія радкі. Яны быццам мяне «упрыгожваюць»… Але і яе не проста «упрыгожваюць», а ўзвышаюць, паказваюць як чалавека чулага, высакароднага чалавека, які думаў пра другіх. Таму, прабачце, і працытую:

*«… Не хварэйце, Алесь Мікалаевіч! Бо тое — і ў такіх маштабах! — не можа рабіць ніхто. Ды і для мяне асабіста Вы з’яўляецеся ці не галоўнай творчай апорай і падтрымкай. Без Вас*

*я зусім знікну з літаратурнай арбіты. Так што трымайцеся!!! Ну хто яшчэ, акрамя Вас, напіша мне пісьмо „ад рукі“ і на паперы пры нашай агульнай камп'ютарызацыі?*

*Вялікі дзякуй Вам за ўсё! З найлепшымі пажаданнямі — Валянціна Локун».*

...Высакародны, чуйны да навакольнага свету чалавек, Валянціна Іванаўна Локун, нягледзячы ні на што, паспела зрабіць на дзіва шмат. Мо таму і здолела шмат напісаць, шмат каго з пісьменнікаў падтрымаць добрым словам, што сама была чалавекам шчырым, адкрытым, светлым. І ёй ахвотна дапамагалі, стараліся нейкім чынам паспрыяць вырашэнню яе творчых клопатаў. Сярод такіх людзей — і акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў. А яшчэ — і празаік, паэтэса, перакладчыца, кандыдат філалагічных навук Валянціна Коўтун.

Зробленае, напісанае чалавекам і крытыкам светлай душы Валянцінай Іванаўнай Локун варта ўвагі чытачоў розных пакаленняў. Яна, чалавек шматпакутны і разам з тым надзіва дзеяздольны, рабіла ўсё магчымае і часам нават немагчымае для таго, каб стварыць свой партрэт сучаснага літаратурнага працэсу. І гэта ёй, як мне ўяўляецца, удалося.

Гэтыя радкі я пішу таму, што варта не проста помніць Валянціну Іванаўну Локун, а і выдаць асобнай кнігай яе артыкулы, рэцэнзіі, выдаць напісанае ёю пра народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Веру, што гэта ўсё ж удасца рэалізаваць.

Хацеў было паставіць кропку, а побач — кніга Валянціны Локун, якую ўжо не раз згадваў: «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гады». У кнізе ёсць і такія радкі: «Мужнасць, самаадданасць — натуральныя якасці свабоднай асобы, якая ўвабрала ў сябе народную мараль і прапусціла яе праз сваё ўнутранае «я». Такім мужным, самаадданым чалавекам, такім мужным літаратуразнаўцам і была Валянціна Іванаўна Локун — літаратуразнаўца з Пінска, з Берасцейшчыны.

У жніўні 2021 года — 75 гадоў з дня нараджэння беларускага літаратуразнаўцы, літаратурнага крытыка, кандыдата філалагічных навук Валянціны Локун. Ёсць час, каб дастойна

падрыхтавацца да гэтай даты, перавыдаць яе творы. А яшчэ — назваць яе імем вуліцу ў Пінску, а мо яшчэ і адну з бібліятэк Пінска ці Пінскага раёна. Мне падаецца, берасцейская грамадскасць, самыя розныя творчыя людзі з гэтай старонкі — будуць толькі «за».

*Алесь Карлюкевіч, краязнавец, літаратуразнавец, журналіст*

# АЛФАВІТНЫ ПАКАЗАЛЬНІК РЭЦЭНЗАВАНЫХ ТВОРАЎ


**А**брочны крыж 54
Абяцанне 20
Ад кахання не паміраюць 58
Алімпіяда 38
Альгердава дзіда 78
Апладненне ёлупа 85
Апошнія і першыя 36
Апраўданне крыві 24, 93
**Б**атальёны просяць агню 52
Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі 131, 134
Белорусцы 137
Бераг жураўліны 89, 90
Берег 13
Благословенные небом 101, 105
Блокада 10
Братэрства 153
Брачная ноч 14
Бумеранг 82
Бунт незапатрабаванага праху 78, 95, 112
**В**азьму твой боль 28, 34
Вайна 143
Вайна і мір 75
Валошкі на мяжы 122
Ведзьміна тоня 136
Векапомныя дні 81, 96
Великая княгиня *гл. Вялікая княгіня*
Верасень 81, 98
Вечнасць дымоў 59
Вечный зов 18
Возьму твою боль *гл. Вазьму твой боль*
Волчья стая 19
Всем смертям назло 12
Выкармак 59, 82
Выкормыш *гл. Выкармак*
Вялікая княгіня 59, 82
Вяртанне 111, 122
Вяртанне да віны 93
Вяшчун Гедзіміна 78
**Г**аспадар-камень 38, 40, 41
Гений 137
Голас народа 70
Горад у нябёсах 112
Государыня и епископ 137
Градабой 34
Грыбавар 38
**Д**араванне 141
Дарога ў два канцы 39
Два крыла 84
Дзень Барыса і Глеба 39
Дзень пачаўся 38
Дзеці Гамункулуса 78
Дзік-бадзяга 36
Дзікі луг 126
Дні паражэння 81, 98
Дожить до рассвета 19
Доказ ад процілеглага 34
Доля — пустацвет 124
Дом з блакітнымі аканіцамі 39
**Ж**ураўліны крык 52
Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека 46
**З**еніт 43
Знак беды *гл. Знак бяды*
Знак бяды 37, 93
Золотые росы 22
Зона тени 100, 112

Зоркі над палігонам 26
**І** дам табе вянок жыцця 78
И смолкли птицы 21
Имя твое 23
**К**азкі сіняй падушкі 147
Как закалялась сталь 7
Каласы пад сярпом тваім 47, 52, 66
Касмічная адысея хлопчыка Стасіка 147
Книги войны 116
Книги и периодические издания до 1941 года 116
Князь Мстиславский 137
Код геніяльнасці 147
Крыж міласэрнасці 59
Крыніца, чыстая вадзіца 44
**Л**абірынты страху 49
Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць 128, 129, 130
Літоўскі воўк 85
Ліхалецце *гл. Вайна*
Лішняе дзіця, або Амплітуда жаданняў 113
Любімы горад 59
Людзі на раздарожжы 77, 98
**М**аксім Танк. Талент, заручаны з небам 135
Малітва да Калымы : лісты з «Эльгена» 114
Марыянеткі і лялькаводы 121
Медальёны 98
Мелодии вселенной 84
Месяц у раі, або Аддай сэрца людзям 113
Метели, декабрь 16
Мёртвым не баліць 52
Мой батальон 19
Мост 38
Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў караля 136
**Н**а імперыялістычнай вайне 70
На мяжы цярпення 113
Надежды и свершения 30
Народныя мсціўцы 61
Не погибнет со мной 149
Не ўсе мы згінем 59, 93
Небесный штурмовик 92, 97
Нельга забыць 66
Нелюбімыя гінуць 85
Ненаписанная повесть 85
Непрыдуманыя гісторыі 152
Неруш 34
Нічые 78
Новыя прыгоды Шубуршуна 147
Ноч на вахце 31
**О**белиск 19
Оправдание крови *гл. Апраўданне крыві*
Оружие для убийцы 85, 95
Откровения 105
**П**адарожжа ў чароўны лес 147
Падение 82
Пакаленне 81
Пакахай мяне, салдацік 59
Пакліканыя 80, 85, 95, 107
Пакуль не развіднела 36
Пакуль не завялі кветкі 53
Палеская мадонна 59, 82
Палеская хроніка 16, 50
Паляванне на Апошняга Жураўля 39
Паляванне на Любаву 78
Памарак 61
Партызан 59
Паэзія Заходняй Беларусі: (1921–1939) 123
Пепел и снег 85
Пíншчына літаратурная 64

Пісьмо ў рай   85, 95
Письмо в рай *гл. Пісьмо ў рай*
Плач перапёлкі   93
Повести Ивана Андреевича   82
Поездка в Тростёну   25
Познія яблыкі   59
Пойти и не вернуться   42
Полесская мадонна
*гл. Палеская мадонна*
Полесская хроника
*гл. Палеская хроніка*
Пошукі будучыні   70, 76, 93
Прагал   38
Праздник продолжается, или Щенок, велосипед и шишка на лбу   147
Приключения тритэшек в Беларуси   147
Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету   147
Птушкі і гнёзды   52
Пушча   34
**Р**аман Ракута *гл. Сівая легенда*
Рандэву на манеўрах   48
Расія   122
Роднае, шчымлівае   132, 136
**С** любовью   67
Салавей   138
Салдат   59
Сатанінскі тур   56, 82
Сатанинский тур
*гл. Сатанінскі тур*
Сачыненне на вольную тэму 38
Свае і чужынцы   93
Свет душы   104
Сівая легенда   47, 66
Скерца для перабітых пальцаў   61
Славься, Мария   82
Сны пра маму   61
Сопровождающий   137
Сотников   19
«Струменя» серебряные струны   106
Суд у Слабадзе   27
Сутокі дзён   34
Сцюжа   70
Сцяжынкамі радзімазнаўства   142
Сыны ідуць у бой   52
Сямейная хроніка   111, 122, 143, 151
**Т**абак   77, 98
Трудный год   15
Трывожнае шчасце   52
Трэцяе вока   51
**У** пошуках будучыні   98
Уліс з Прускі   78, 85, 111, 122
Усход   111, 122
**Ф**ранцужанка   61
Футбол на замініраваным полі   34
**Х**мельнае прозвішча   124
Хозяин-камень *гл. Гаспадар-камень*
Хроника пикирующего разведчика   92, 97
Хрыстос прызямліўся ў Гародні   47, 52, 66
Хутаранец   61
**Ц**веразілаўка   61
Цыганскі кароль   47, 52, 66
**Ч**аканне   61
Чужое неба   36
Чужие   92, 97
**Ш**munуй імя сваё   39
Шаны   136
**Ю**ргон   112

# ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


**А**дамовіч А. 52
Андреева Н. 188
Анцух Л. 202
Арлоў У. А. 48
Асіпенка А. 45, 49, 57, 72, 74, 172
**Б**агданава Г. 61, 78
Бакланаў Р. 52
Барэйша М. 44
Безлепкина О. 203
Беларуска Л. *гл. Коўтун В.*
Бензярук А. 136
Блакіт В. 39
Бондараў Ю. 13, 52
Бондарев Ю. *гл. Бондараў Ю.*
Борисевич В. 102
Боровко В. М. 22
Брава А. 141
Бразгуноў А. У. 181
Брыль Я. 52
Бугаёў Д. Я. 119
Будавей М. С. 49, 53
Буторына І. А. 142
Быкаў В. 19, 33, 35, 37, 42, 45, 52, 59, 61, 62, 65, 70, 86, 91, 93, 102, 115, 183
Быков В. *гл. Быкаў В.*
Бядуля З. 138
**В**агер З. 89, 90
Вальчук А. В. 128–130
Васільеў Б. 52
Василевицкий В. В. 199
Васюкова Г. 22
Величко Э. Г. 67
Вепраў Т. А. 64
Вецік М. А. 31
Водоносов М. 30
**Г**апееў В. 120, 136
Гаранін С. Л. 140
Гардзей В. 39
Гарэцкі М. 70
Герчик М. *гл. Герчык М.*
Герчык М. 85, 95
Гігевіч В. 34, 45
Гиль В. 38, 203
Гніламёдаў У. В. 69, 73, 74, 78, 85, 111, 120, 122, 123, 125, 134, 139, 140, 143, 150, 151, 202, 204
Гниломёдов В. В. *гл. Гніламёдаў У. В.*
Голубев С. Г. 99
Горбачев М. 14
Горбачевская В. А. 116
Горький М. 3
Гришковец В. 99, 103, 192
Грышкевіч С. 176
**Д**айнека Л. 34, 45
Далідовіч Г. 38, 40, 41, 155
Дамашэвіч У. 72, 73, 112, 124, 155, 172
Дастаеўскі Ф. 91
Дземідовіч Т. А. 221
Денисова С. 203
Дзенісовіч І. 217
Дзімаў Д. 76, 77, 98
Дубоўскі М. 61
**Е**леневский Н. 92, 97, 99, 103
Еўфрасіння Полацкая 107
**Ж**акевіч Э. Э. 173
Ждан А. 137, 145, 147, 149, 206
Ждан О. *гл. Ждан А.*
Жилин Е. И. 25
Жук А. 26, 39, 59, 61, 72, 172
Жук Е. И. 116

Жукроўскі В.   81, 98
Жураўлёў В. П.   69
**З**айцев С.   85
Зубков В. *гл. Шапіра С. Ф.*
**И**ванов А.   18
Ильенков В.   197, 201, 209
Іпатава В.   78
**К**аваленка В. А.   52, 110, 139, 158
Кадзетава В. М.   58
Казько В.   27, 34, 45, 72, 78, 95, 112
Калодзежны Л.   59
Камю А.   91
Кандрацьеў В.   52
Кантор Д.   180
Карамазаў В. Ф.   34, 39, 54, 72, 172
Караткевіч У.   46, 47, 52, 66
Карлюкевіч А. М.   46, 133, 142, 146, 147, 153, 158
Кибак И. А.   174, 175, 199
Кісялёў Г. К.   160, 173
Коваленко В. А. *гл. Каваленка В. А.*
Ковтун В. *гл. Коўтун В.*
Козакевич В. В.   84
Козлов А.   112
Козько В. *гл. Казько В.*
Колас Я.   32
Коўтун В. М.   59, 68, 72, 80, 85, 95, 103, 107, 114, 117–119, 127, 139, 154, 172
Кохнович Н. И.   201
Крук У.   86, 87, 127
Крэйдзіч А.   132, 136, 190, 194, 196, 201, 211, 213, 218
Кудравец А.   38, 59
Кулажанка Л.   195
Купрэеў М.   120
Курсаў В. М.   160
**Л**аврович Н. А.   103, 104
Лакотка А. І.   140
Лаўшук С. С.   73, 74, 139, 181
Лецка Я.   39
Ліпскі У.   142
Ліхадзееў У.   195
Лойка А. А.   32
Лынькоў М.   81, 96
Лукашык У. А.   41
Ляшук М. І.   64, 99, 101, 103, 105, 106, 152, 172, 189, 197, 209
**М**алышева З. Г.   144
Мальдзіс А. І.   46, 66, 195
Мархель У. І.   75, 98, 181
Масарэнка А.   53, 72
Маяковский В. В.   6
Мележ І.   16, 50, 72, 172
Мележ И. *гл. Мележ І.*
Мелешенко В. *гл. Меляшэнка У.*
Меляшэнка У.   83, 167, 172
Мікуліч М. У.   122, 123, 128–131, 134, 135
Мінзер М.   115
Мірчук А.   168, 171
Місько П.   34, 45
Мішчанчук М.   163
Мулярчик А. В.   209
**Н**аварич А.   85
Навуменка І. Я.   59, 139
Налкоўская З.   98
Николайчик П.   105
Новиков А.   205–207
**О**лдзінгтон Р.   91
Островский А. Н.   4
Островский Н.   7, 9
**П**авлов В.   165
Пальчэўскі А.   31
Парахневіч М.   20
Парчук Н. М.   221
Пашкевіч А.   78

Петрова С.   184
*гл. Побединская С.*
Півторак Г.   79
Пінчук М. У.   181
Побединская С.   167, 177–179, 186, 191, 193
Поздняков М.   207
Попов Г. Л.   25
Правдин В.   85
Приступа Н.   60, 67, 84, 88, 103
Проскурин П.   23
Пташнікаў І.   38, 61, 85
Пташников И. *гл. Пташнікаў І.*
Пуйманава М.   76, 77, 98
Путрамант Е.  81, 98
Пушкин А. С.   8
Пятровіч Б.   61
**Р**адкевіч Я.   34
Рубанаў У.   38
Рублевская Л. *гл. Рублеўская Л.*
Рублеўская Л.   78, 203
Рэмарк Э.   91
**С**авицкі А.   85, 95
Савицкий А. *гл. Савіцкі А.*
Сартр Ж.-П.   91
Сачанка Б. І.   35, 36, 45, 51
Сачанка С.   195
Саченко Б. *гл. Сачанка Б. І.*
Сергеева И.   24
Сіманаў К.   52
Синкевич П. Н.   174, 199
Соловей Л.   30
Солоневич Ю.   99, 100, 103, 112
Сотнікаў М. Ю. *гл. Южык М.*
Станкевич Ю.   85
Станюта А.   38
Стэндаль Ф.   138
**Т**аламай Е.   108
Талстой Л. М.   70, 75, 79
Танк М.   135
Титов В.   12
Тычина М. А. *гл. Тычына М. А.*
Тычына М. А.   75, 134, 155
**Ф**едарэнка А.   59, 61, 78, 126, 205
Федорович В.   200
Фолкнер У.   91
Фучик Ю.   2
**Х**адасевіч-Лісава К.   147
Хвагіна Т. А.   108
Хомчанка В.   29
Хэмінгуэй Э.   91
**Ц**вірка К.   155
Цітовіч Б. Б.   43
Цупрык Л. А.   194
**Ч**аковский А.   10
Чигринов И. *гл. Чыгрынаў І.*
Чорны К.   70, 76, 77, 93, 94, 98
Чыгрынаў І.   24, 35, 45, 52, 59, 87, 93
Чэшка Б.   81
**Ш**аладонава Ж. С.   75
Шамякин И. *гл. Шамякін І.*
Шамякін І.   14, 21, 28, 34, 43, 45, 52, 55, 56, 59, 69, 82, 172
Шамякіна А.   215, 219
Шапіра С. Ф.   109, 156, 157, 159, 160, 162, 165, 169, 170, 183
Шапиро С. *гл. Шапіра С. Ф.*
Шатырёнок И.   204, 208, 220
Шаўлякова-Барзенка І. Л.   139
Шкурко Т.   66
Шушко А.   84, 103, 136, 161
Шолохов М.   11
Федоров С. *гл. Шапіра С. Ф.*
**Ю**жык М.   121
Юхнюк М.   63
**Я**кимович А.   15
Якутович В. В.   83
Янищиц Е.   103

# ЗМЕСТ

Ад складальніка .......... 3

Валянціна Іванаўна Локун (06.08.1946–16.06.2016): кароткі біяграфічны нарыс .......... 5

Даты біяграфіі .......... 7

Літаратуразнаўчыя і навуковыя работы В. І. Локун (1973–2016 гг.) .......... 9

Літаратура аб жыцці і творчасці (1984–2018 гг.) .......... 38

Узняцца да лёсу чалавечага: аўтабіяграфія .......... 49

*Карлюкевіч А.* Пяць папяровых лістоў: валянціна локун — шчырая працаўніца літаратурнай крытыкі .......... 59

Алфавітны паказальнік рэцэнзаваных твораў .......... 69

Імянны паказальнік .......... 72

Даведачнае выданне

**ВАЛЯНЦІНА ІВАНАЎНА ЛОКУН**
Біябібліяграфічны паказальнік

Карэктура: Л. Н. Саханчук, Г. І. Бабрук, Е. І. Жук
Адказны за выпуск: Т. М. Калмакова
Тэхнічны рэдактар: К. В. Якаўлева
Вёрстка: К. В. Якаўлева

Падпісана да друку 01.07.2019.
Фармат 60 × 84/16. Папера афсетная. Гарнітура Times.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 5,12. Ул.-выд. арк. .
Тыраж 50 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Беларускі навукова-даследчы інстытут транспарту
„Транстэхніка“».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/137 ад 8 студзеня 2014 г.
Вул. Платонава, 22, 220005, г. Мінск.